Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

Савецкая Беларусь

Орган Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў БССР.

КОШТ НУМАРУ 4 кап.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 478. Рэдактара—№ 769.

Матар'ял прымаецца—з 9-й да 3½ гадз.

Кавыкарыстаныя рукапісы назад аўтарам не вяртаюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА:

На 1 месяц	— 70 к.
„ 3 „	2 р. — к.
„ 6 „	4 р. — к.
„ 1 год	7 р. — к.
Зьмена адрасу: іншагародніх	—20 к.
мясцовых	—10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ:

За радок пайпарэлі пасьля тэксту — р. 50 к.
За радок пайпарэлі наперад тэксту 1 р. — к.
За радок пайпарэлі перад тэкстам 1 р. 50 к.
Сьменныя на 50 проц. дарожэй.
Звыш тарыфу бярэцца 10 проц. налогу.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ:

За 1 дакумант	35 кап.
За кожны дадатковы	15 „
Беспрацоўн. і чырвоцармейцы за дакумант	15 „
За кожны дадатковы	5 „

Публікацыі ЗАГС'—3 руб.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ў канторы газэты, ва ўсіх аддзяленьнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і ва ўсіх пашт.-тэл. канторах.

АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газэты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

8-ы ГОД ВЫДАНЬНЯ. ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА. № 227 (2119) Чацьвер, 6-га кастрычніка 1927 г.

Адчыненьне Першага Менскага Акруговага Зьезду Работніц і Сялянак АДБУДЗЕЦЦА 6-га кастрычніка а 6 гадзіне ўвечары ў клюбе Карла Маркса.

ПАВЕСТКА ДНЮ ЗЬЕЗДУ:

1. Міжнароднае і ўнутранае становішча СССР. (Дакл. т. Галадзед).
2. Аб рабоце Саветаў і ўдзеле ў ёй жанчын-работніц і сялянак. (Дакл. т. Жуковіч).
3. Аб народнай асьвеце і ўсеагульным навучаньні (Дакл. т. Юшкевіч).
4. Аб ахове здароўя. (Дакл. т. Нісенбаум).
5. Выбары дэлегатак на ўсесаюзны зьезд.

Выдача мандатаў дэлегатнам адбудзецца 6-га кастрычніка ў сэкратарыяце АВК з 10 да 3-х гадз. (Пляц Волі, дом № 4, 3-ці паверх), а з 5 да 6 гадз.—у клюбе Карла Маркса (вул. Карла Маркса).

ДА ЗЬЕЗДУ РАБОТНІЦ І СЯЛЯНАК

Да 10 гадавіны Кастрычніка зьбіраецца ўсесаюзны зьезд работніц і сялянак—членаў саветаў.

Сёньня ў Менску адчыняецца зьезд работніц і сялянак Менскай акругі.

Гэты зьезд навінен падагуліць 10 год вялізарнай працы партыі па ўцягваньню працоўных жанчын у сацыялістычнае будаўніцтва. Зьезд павінен паказаць, у якой меры працоўная жанчына навучылася кіраваць дзяржавай.

Не ў пяршыню склікаецца зьезд работніц і сялянак. Дзевяць год таму назад, напярэдадні першай гадавіны Кастрычніка, быў склікан першы гэткі самы зьезд. Тады яшчэ ня можна было і думаць аб зьезьдзе работніц і сялянак-членаў саветаў. Іх яшчэ ня было. Ня толькі да вёсак, але нават да фабрык і заводаў не дакацілася вестка аб тых правах, якія заваяваны працоўнай жанчынай у Кастрычнікавыя дні. Гэта быў цяжкі час. Маладая савецкая ўлада рашуча адбівалася на шматлікіх франтох. Рэвалюцыя вымагала ўсё новых патуг і напружаньня, сэнс і мэты якіх жаночая адсталая маса не заўсёды разумела. Тады праз зьезд партыя зьвярнулася да шматмільённай жаночай масы з заклікам устаць на абарону савецкай улады. Упяршыню работніцы і сялянкі былі закліканы вучыцца кіраваць дзяржавай. Тысячы дэлегатак зьезду разьнесла на ўсёй краіне словы Леніна, зьвернутыя да работніцы і сялянкі. Тысяча дэлегатак першага зьезду дапамагла партыі расштурхаць найбольш адсталыя пласты жаночай масы, накіраваць іх абуджаную актыўнасьць на логве сацыялістычнага будаўніцтва.

Прайшло дзевяць год. За гэты час вырас шматтысячны жаночы актыў, які ўжо ня толькі вучыцца, але на практыцы праводзіць вялізарную працу па кіраўніцтву краінай. На гэты зьезд прыедуць дзесяткі і сотні членаў і старшынь сельсаветаў, якія ўжо добра спраўляюцца са складаным гаспадаркай вёскі.

Уся жаночая маса ведае, што партыя, урад, уся краіна чакаюць ад зьезду дзелавой сур'ёзнай працы. Дэлегаткі павінны на зьезд прывезьці ня толькі падагулены вопыт праробленай працы, але і практычныя прапановы па ўзмацненьню абароназдольнасьці краіны, па разгортваньню сацыялістычнага будаўніцтва на другое дзесяцігодзьдзе Кастрычнікавай рэвалюцыі.

Даклад тав. Галадзеда па пытаньню нашага міжнароднага і ўнутранага становішча, даклады аб народнай асьвеце, ахове здароўя, удзел жанчын у савецкім будаўніцтве і інш. павінны разгарнуць перад работніцамі і сялянкамі—удзельнікамі Менскага акруговага зьезду ўсе пэрспэктывы нашага далейшага будаўніцтва і ролю, якую ў гэтым павінна адыгрываць працоўная жанчына.

Дэлегаткі з сабой прывязуць калектыўны вопыт мас і практычныя прапановы па разгортваньню самадзейнасьці ва ўсіх галінах жыцьця савецкай дзяржавы і ў першую чаргу ў справе большага ўцягваньня жанчын у перавыбары і працу саветаў.

Зьезд жанчын павінен зрабіцца асновай для вялізарнага разгортваньня той працы сярод жанчын, якая пачалася пад кіраўніцтвам Леніна і вядзецца яго партыяй.

Вітаем зьезд жанчын Менскай акругі. Пажадаем яму посьпеху і творчай працы.

ДАЛЕЙШЫ КРОК МАКДАНАЛЬДА Ў БОК РЭАКЦЫІ.

На зьезьдзе рабочае партыі.

Польліт выкрывае прыслужнікаў капіталу.

БЛЕКПУЛЬ, 4-X. На сёньнешнім ранішнім пасяджэньні зьезду рабочае партыі адбыліся спрэчкі па пададзенай выканкомам рэзалюцыі аб праграме, з якою рабочая партыя павінна выступіць на ўсеагульных выбарах. Рэзалюцыя мае шмат агульных месц. Макданальд, які падаў рэзалюцыю, сказаў беззьмястоўную прамову.

Польліт падкрэсьліў, што ніводная з рэзалюцый, пададзеных выканкомам, ніводным словам не памінае пра сацыялізм, і зазначыў, што ў сапраўды добрай праграме павінна быць адзінства рабочага руху, а значыць павінны быць скасаваны пастановы Ліверпульскае канфэрэнцыі рабочае партыі (аб выключэньні камуністаў). Калі Польліт распачаў гаварыць пра гэта, старшыня пазбавіў яго слова, спасылаючыся на тое, што скончыўся яго час.

ЗАТЫКАНЬНЕ РОТУ РАДАВЫМ СЯБРОМ.—«САЦЫЯЛІЗМ НА ДРУГІМ ПЛЯНЕ».—НЯГОДНАЯ СПРОБА АПРАЎДАЦЬ ПАЛІТЫКУ ЎРАДУ Ў КІТАІ.

БЛЕКПУЛЬ, 4-10. Пасьля пазбаўленьня Політа слова спрэчкі адбыліся. Гендэрсон, Томас, Бэвін і інш. крытыкавалі палітыку незалежнае рабочае партыі. Радавыя дэлегаты былі пазбаўлены магчымасьці ўдзельнічаць у спрэчках, бо старшыня даваў слова пераважна „выдатным" прамоўцам.

Макданальд у заключным слове заявіў, што сацыялізм заўсёды будзе „на другім пляне" партыйнае праграмы. Прапанаваная Макданальдам рэзалюцыя ўхвалена зьездам.

На вячорнім пасяджэньні зьезд абмяркоўваў справаздачу выканкому наконт закону аб прафсаюзах. Пасьля спрэчак усе рэзалюцыі наконт закону аб прафсаюзах адхілены, апроч рэзалюцыі, пададзенай нацыянальным саюзам некваліфікаваных і муніцыпальных рабочых. У гэтай рэзалюцыі, ухваленай без абмеркаваньня, зьезд ганьбіць закон аб прафсаюзах, заяўляе аб сваёй пастанове выкарыстаць усе законныя сродкі для аднаўленьня правоў і волі прафсаюзаў, а таксама бярэ на сябе абавязацельства дапамагаць рабочаму руху ў яго працы, якая мае на мэце дамагчыся скасаваньня закону, што зьяўляецца самаю горшаю формаю клясавага заканадаўніцтва.

Па прапанове камуніста Алана (фэдэрацыя горнаработых) зьезд ушанаваў уставаньнем памяць Сако і Ванцэці.

Прадстаўнікі левага крыла Саутхол і Кершаў падалі прапанову адхіліць частку справаздачы, прысьвечаную пытаньню аб растраце расейскіх белагвардзейцаў, дзе ганьбіцца гэта мера. Прапанова Саутола і Кершаў была адхілена.

Наконт пытаньня аб рэформе палаты лёрдаў Крэмі ад імя выканкому падаў рэзалюцыю, якая кажа „пра незамарымую апазіцыю ўрадавай прапанове аб так званай рэформе палаты лёрдаў, якая (прапанова) пазбаўляе дэмакратычна абраную палату вобшчым ад поўнага кантролю над фінансамі і падаткамі і робіць немагчымым ажыцьцявіць волю народу наконт зьмены статуту верхняе палаты без ухвалы самой палаты лёрдаў. Камуніст Карыган (аб'яднаны саюз машынабудаўнікоў) супярэчыў проці рэзалюцыі, зазначыўшы, што яна ў прынцыпе згаджаецца з іспаваньнем палаты лёрдаў, але старшыня заявіў, што рэзалюцыя ўхвалена.

Цэнтральным момантам вячорняга пасяджэньня былі спрэчкі на пытаньні аб палітыцы ў Кітаі. Справаздача выканкому складалася пераважна з афіцыйных заяў лідэраў партыі, якія былі разьлічаны на заспакоеньне ўстрывожаных пралетарскіх мас Англіі і на тое, каб захаваць ад іх сапраўдны характар ангельскіх учынкаў у Кітаі. Прапанавая выканкомам рэзалюцыя грунтуецца на Маргейцкай рэзалюцыі рабочае партыі на пытаньні аб Кітаі, ухваленай на леташнім зьезьдзе. У гэтай рэзалюцыі рабочая партыя ставіць сабе ў заслугу імкненьне ўраду „прытрымліваца ў Кітаі палітыкі, якая забясьпечыць прыяцельскія адносіны".

Політ прапанаваў адхіліць гэтую рэзалюцыю і востра выкрываў «надзвычайнае» завярэньне лідэраў выканкому, нібыта ангельскі ўрад спрабаваў прытрымліваца Маргейцкае рэзалюцыі. Брэйльс-форд ад імя незалежнае рабочае партыі падтрымаў прапанову Політа. Прапанова Політа была адхілена.

Перамога СССР над Англіяй на Усходзе.

Нямецкая прэса аб савецка-пэрсідзкіх згодах.

БЭРЛІН, 4-X. Газэты «Фосішэ Цэйтунг» і „Кельнішэ Цэйтунг" наконт падпісаньня савецка-пэрсідзкіх згод зазначаюць, што гэтыя згоды сьведчаць аб выдатнай перамозе савецкіх дыплёматаў над ангельскаю палітыкаю ў Азіі.

«Вялікі крок, шчасьлівы акт».

ТЭГЕРАН, 1-X. Усе газэты поўнасьцю зьмяшчаюць падрабязныя паведамленьні з Масквы аб падпісаньні савецка-пэрсідзкіх згод, а таксама прамовы тав. Чычэрына і пана Алі-Галі-Хана Ансары, гутарку тав. Карахана і артыкулы «Известий» і «Правды».

Усе газэты прысьвяцілі падпісаньню згод перадавіцы, у якіх называюць згоды «вялікім крокам» і «шчасьлівым актам».

Рэпрэсіі проці ЦК КП Аўстрыі.

ВЕНА, 3-X. Венская пракуратура прыцягвае да адказнасьці цэнтральны камітэт аўстрыйскае камуністычнае партыі ў поўным складзе за адозву, агалошаную ім 16-га ліпеня.

Французская рэакцыя правакуе разрыў.

Мана агенцтва Гаваса.

Паведамленьне ТАСС.

ЭРБЭТ НЯ МЕЎ СПАТКАНЬНЯ З ЧЫЧЭРЫНЫМ.

ТАСС упаўнаважан афіцыйна адхіліць паведамленьне Гаваса ад 3-га кастрычніка аб тым, нібы францускі пасол у Маскве Эрбэрт 2-га кастрычніка меў гутарку з Чычэрыным па пытаньні аб адкліку Ракоўскага. Эрбэт быў прыняты наркомам Чычэрыным апошні раз 21-га верасьня і пасьля гэтае даты Чычэрын яго ня бачыў і ніякіх перамоў з ім ня вёў.

СССР ПРОЦІ АДАЗВАНЬНЯ РАКОЎСКАГА.

Французкая прэса агаласіла паведамленьне маскоўскага карэспандэнта «Юнайтэд Прэс», нібы т. Чычэрын заявіў аб гатоўнасьці адклікаць Ракоўскага

ТАСС упаўнаважан Народным Камісарыятам Замежных Спраў заявіць, што паведамленьне карэспандэнта „Юнайтэд Прэс" адносна Ракоўскага не адпавядае сапраўднасьці. Ні тав. Чычэрын, ні хто-небудзь іншы з афіцыйных асоб за апошнія дні не даваў гутаркі і не рабіў ніякіх заяў па справе Ракоўскага ні карэспандэнту „Юнайтэд Прэс", ні якім-бы там ні было іншым прадстаўніком прэсы.

Агенцтву вядома, наадварот, што НК Замежных Спраў стаіў і стаіць, як ён аб гэтым увесь час заяўляў пану Эрбэту, проці адкліку Ракоўскага, бо ня бачыць для гэтага ніякіх апраўданьняў і лічыць, што адклік Ракоўскага ня можа не адбіцца самым вяспрыяючым парадкам на адносінах і перамовах між абодвымі ўрадамі.

ПРАВЫЯ СКІНУЛІ МАСКУ.

У Існасьці адазваньня Ракоўскага ляжыць разрыў.

ПАРЫЖ, 4-X. Орган сацыялістаў «Популер» пад загалоўкам «Прызнаньне» зьмяшчае такі вынятак з артыкулу правае газэты «Журналь дэ Дэба»:

«Левы друк абуран, што ўся кампанія проці Ракоўскага мае канчатковую мэту —разрыў з саветамі. Зразумела, што яна мае гэтую мэту, ніхто ніколі ня думаў гэтага адхіляць. Ракоўскі падпісаў адозву, якая заклікае салдат да здрады. Кожны сябра 3-га Інтэрнацыяналу зробіць тое-ж самае, і, з гэтае прычыны, захаваньне савецкага пасольства робіцца немагчымым".

«Популер» піша наконт гэтага так: «Вось, нарэшце, шчырае прызнаньне. Але якая-ж гэта аплявуха Эрыё і Брыяну».

Лева-буржуазная «Волёнтэ» падкрэсьлівае, што, як прызнае «Журналь дэ Дэба», кампанія проці Ракоўскага роўназначна кампаніі за разрыў і заяўляе, што гэта надзвычайна непакоіць грамадзкую думку.

Палата маўчыць.

Патрабаваньне Бэртона склікаць парляманцкую камісію.

ПАРЫЖ, 4-X. Агенцтва Гаваса паведамляе: «Бэртон (камуністычны дэпутат) зьвярнуўся да старшыні парляманцкае камісіі на замежных справах Франклін Буйёна з лістам, у якім просіць назначыць у магчыма бліжэйшым часе пасяджэньне камісіі з прычыны сур'ёзнай палемікі, якая ўзьнялася навакол асобы Ракоўскага і якая можа мець у выніку разрыў франка-савецкіх зносін.

Бэртон напамінае, што камісія не пасядала ўжо ў працягу некалькіх месяцаў і што пры сучасных варунках яе маўчаньне можа паказацца надазроным.

Сацыялістычны дэпутат Фантані зьвярнуўся да Франклін Буйёна з такою-ж просьбаю.

Разгром мукдэнцаў войскам Ен-Сі-Шана.

Шанкайскія сілы ўвайшлі ў Калган.—Выступленьне Фыня на Шандунь.

Рэвалюцыйныя войскі пакінулі Сватоу.

Паражэньне мукдэнцаў пад Калганам.

У Ен-Сі-Шана 170.000 войска

ШАНХАЙ, 4-X. Водлуг паведамленьня з Пекіну, 1-га кастрычніка войска Ен-Сі-Шана перайшло ў наступ проці мукдэнскага войска. Пад Калганам мукдэнцы пацярпелі сур'ёзнае паражэньне і адступаюць да перазалу Ханькоу. Пад Чэнцінфу мукдэнцы таксама пацярпелі паражэньне і адступілі да Ціньчжоу, адзуль адкрываюць сабе шлях на Баоцінг і далей на Пекін.

Перадаюць, што ў Ен-Сі-Шана 15 дывізій пяхоты і 10 дывізій конніцы—усяго 170 тысяч штыкоў і шаблаў.

Згода Ен-Сі-Шана з Фынем.

ШАНХАЙ, 4-10. Водлуг чутак, між Ен-Сі-Шанам і Фынь-Юй-Сянам адбылася згода аб супольных апэрацыях проці паўночцаў, прычым войска Фынь-Юй-Сяна павінна наступаць у правінцыі Шаньдунь уздоўж Лунхайскае чыгункі.

Войскі Ен-Сі-Шана ў Калгане.

ШАНХАЙ, 4-X. Пасьля перамогі Ен-Сі-Шана над мукдэнскім войскам у райёне Пекін-Суйюанскай чыгункі мукдэнцы эвакуавалі Калган, які занят войскам Ен-Сі-Шана. Перадавыя часьці Ен-Сі-Шана гоняцца за мукдэнцамі, якія адступаюць у напрамку на Суанхуа па Пекін-Суйюанскай чыгунцы.

Сватоу эвакуавана.

Контр-рэвалюц. распраўляецца з спачуваючымі чырвоным

ШАНХАЙ, 4-X. Кітайскія газэты паведамляюць, што войскі Хо-Люна і Іе-Ціна пакінулі Сватоу ноччу на 2-га кастрычніка.

У паведамленьні Рэйтэра з Ганконгу ад 3-га кастрычніка гаворыцца: „Белае гуандунскае войска канчаткова заўладала Сватоу".

Не зважаючы на гэтыя паведамленьні, ваеннае становішча ў райёне Сватоу застаецца нявыразным, бо ўсе крыніцы сьцьвярджаюць, што рэвалюцыйнае войска эвакуавала горад у поўным парадку і адышло да Чаоану, прычым у Сватоу значных сіл рэвалюцыйнага войска і ня было. Некаторыя кітайскія газэты бачаць у гэтым адступленьні спробу прабіцца да Усходняе рэчкі і далей, назад у Цьзянсі.

Адначасова з выхадам рэвалюцыйнага войска, у Сватоу пачаліся вобыскі і расстрэлы асоб, западозраных у спачуваньні рэвалюцыйнаму войску.

У ганконскіх газэтах гаворыцца, што становішча рэвалюцыйнага войска ў Сватоу ўскладнілася з прычыны высадкі японскага войска, якому консульскі корпус даручыў „падтрымліваць парадак", і эканамічнага байкоту, абвешчанага буржуазеяй.

Цяжкае становішча рэвалюцыйных войск.

Рабочыя дэзарганізуюць тыл контр-рэвалюцыі.

ШАНХАЙ, 4-X. Ганконскія газэты паведамляюць, што рэвалюцыйнае войска Іе-Ціна і Хо-Люна знаходзіцца ў вельмі цяжкім становішчы. З поўначы на яго наступае цьзянсійская армія генэрала Хуап-Шао-Сюна, з усходу фуцьзянская армія, з паўночнага захаду войска Чэн-Ці-Чэна, з захаду Цянь-Да-Чун і Ван-Це-Чун. Перад Сватоу ў порце знаходзіцца тры кітайскія канонаркі.

Газэты зазначаюць, што найбольш выгодны шлях для адступленьня рэвалюцыйнага войска—гэта шлях на Чэйян (г. зн. на паўднёвы захад ад Сватоу), дзе ўрадавыя сілы параўнаўча слабыя. Калі рэвалюцыйнаму войску ўдасца прабіцца праз Чэйян, дык яно здолее злучыцца з сялянскімі атрадамі, якія змагаюцца проці ўрадавага войска ў Хайфыні і Люфыні.

Кітайскі друк паведамляе, што Кантон - Гулонская чыгунка перарвана ў некаторых мясцох. Чыгуначныя зносіны Кантон-Ганконг перарваны. Перарэзаны таксама шмат дзе тэлеграфныя правады. Водлуг думкі кітайскіх газэт, гэта справа рук камуністычна настроеных рабочых.

Рэвалюцыйная ўлада ў правінцыі Хубэй.

ШАНХАЙ, 4-X. Перадаюць, што 4 паветы ў правінцыі Хубэй знаходзяцца ва ўладзе камуністаў. У адным толькі Гуананьскім павеце колькасьць рэвалюцыйных атрадаў складае 10 тысяч чалавек з кулямётамі і артылерыяй.

ЗАХОП АНГЕЛЬЦАМІ РАНЕЙШАЕ ХАНЬКОЎСКАЕ КАНЦЭСІІ.

ХАНЬКОЎ, 29-IX. (Затрымана дастаўкай). Сярод кітайскага жыхарства Ханькоу наглядаецца вялікае абурэньне з прычыны рантоўнага таемнага аб'езду Чжан-Цьзі-І,—начальніка управы ранейшае ангельскае канцэсіі ў Ханькоу і старшага камісара па замежных справах, ранейшага супрацоўніка Лўгіня Чэн.

Як паведамляюць, перад сваім пабегам з Ханькоу, Чжан-Цьзі-І меў тайнае спатканьне з ангельскім консулам у Ханькоу Партэрам на ангельскім параходзе, на якім ён і выехаў з Ханькоу 26-га верасьня. Пасьля яго аб'езду ангельцы явачным парадкам захапілі ўправу ранейшай ангельскай канцэсіі і паставілі на чале ўправы ангельца Эйтса, ранейшага чыноўніка муніцыпальнае рады ангельскае канцэсіі. Эйтс зараз-жа загадаў ад падначаленьні яму ўсіх чыноўнікаў кіраўніцтва канцэсіяй і вынесьці з памяшканьня канцэляры ўправы партрэты Сун-Ят-Сэна і антыімпэрыялістычныя лёзунгі, якія віселі на сьцепах.

Ангельцы вядуць шаленую кампанію за афіцыйнае скасаваньне ўгавору, падпісанага О'Маллі і Яўгінем Чэнам аб парадку кіраўніцтва ранейшай ангельскай канцэсіяй у Ханькоу, спрабуючы з дапамогаю ханькоўскіх мілітарыстаў захапіць канцэсію назад у свае рукі.

Абвастрэньне руху проці „надзвыч. к-ту".

ШАНХАЙ, 4-10. Ва Ухане ня спыняецца кампанія проці надзвычайнага камітэту Гаміндану. У Ханькоу адбылося некалькі мітынгаў, на якіх ухвалены вострыя рэзалюцыі проці надзвычайнага камітэту. Уханскі аддзел Гаміндану разьвівае энэргічную агітацыю і прыцягвае на свой бок «рэарганізаваныя» сялянскі саюз і студэнцкі саюз. Рэзалюцыі, ухваленыя на сходах гэтых арганізацый, патрабуюць роспуску надзвычайнага камітэту. Газэты зьмяшчаюць вельмі вострыя артыкулы, асабліва ганьбуючы ўваход у надзвычайны камітэт прадстаўнікоў Сішанскае групы, якія былі выгнаны з партыі яшчэ Сун-Ят-Сэнам, як пявартыя».

Разам з заўтрашнім нумарам газэты рассылаецца дадаткам прамова тав. Карклiна на пленуме ЦК КПБ і рэзалюцыя пленуму.

Падрыхтоўка разгону нямецкае кампартыі.

Суд над членамі ЦК кампартыі.

Сярод падсудных—12 дэпутатаў рэйхстагу і ляндтагаў.

ЛЕЙПЦЫГ, 4-X. Сёньня ў вярхоўным судзе распачаўся разгляд справы ЦК нямецкае кампартыі. Да адказнасьці прыцягваецца 13 камуністаў, з іх 9 уваходзілі ў 1923 годзе ў склад ЦК партыі. З ліку абвінавачваемых—Штэкер, Гекерт, Гернле, Кэнен, Рэмэле і Пфэйфер—дэпутаты рэйхстагу; Эбэрлен і Пік—дэпутаты прускага ляндтагу; Бэхтэр — дэпутат саксонскага ляндтагу; Шуман, Фрэйліх і Ліндаў—ранейшыя дэпутаты рэйхстагу. Клара Цэткін значыцца ў акце абвінавачаньня, як уцёкшая. Усім прыцягваемым да адказнасьці высунута абвінавачаньне ў дзяржаўнай здрадзе.

Палітычнае значэньне працэсу ў тым, каб падрыхтаваць роспуск кампартыі і застрашыць сацыял-дэмакратычныя рабочыя масы, якія хоць і павольна, але няўхільна адыходзяць ад сацыял-дэмакратыі да камуністаў.

Пасьля адчыненьня пасяджэньня суду старшынствуючы Ніднэр сьцьвердзіў, што абвінавачаныя на суд не зьявіліся. Прадстаўнік пракуратуры заявіў, што позвы аб яўцы былі пасланы ўсім абвінавачаным своечасна. Абаронца Обух падаў ад імя абвінавачаных прапанову адкласьці разгляд справы. У адказ на гэта обэр-пракурор Нэрнер прапанаваў суду даць загад аб дастаўцы абвінавачаных у суд, з агаворкаю, што гэтая прапанова не распаўсюджваецца на абвінавачаных дэпутатаў, у адносінах да якіх пракуратура падасьць адпаведную прапанову ў парлямант.

Працэс адкладзен з-за адсутнасьці падсудных.

ЛЕЙПЦЫГ, 4-X. Пасьля перарыву пасяджэньня суду старшыня Ніднэр агаласіў пастанову суду наконт прапановы абароны адкласьці разгляд справы і прапановы обэр-пракурора даставіць у суд абвінавачаных, якія не карыстаюцца дэпутацкаю недатычнасьцю. Суд ухваліў адкласьці разгляд справы і адначіць яго толькі пасьля таго, як рэйхстаг і прускі ляндтаг дадуць суду паўнамоцтвы забясьпечыць правядзеньне працэсу ўсімі магчымымі спосабамі прымусу. Усіх абвінавачаных, якія ня маюць дэпутацкіх паўнамоцтваў, суд ухваліў даставіць да моманту аднаўленьня працэсу.

Байкот абвінавачанымі буржуазнага суда.

БЭРЛІН, 4-X. ЦК нямецкае кампартыі ўхваліў пастанову, у якой прапануе членам партыі, прыцягнутым да адказнасьці па справе ЦК нямецкае кампартыі, не зьяўляцца ў суд.

Адначасна цэнтральны камітэт зьвярнуўся да рабочых з заклікам узмацніць барацьбу проці буржуазнае юстыцыі, за ўсеагульную амністыю палітычным і проці ўраду буржуазнага блёку.

Яшчэ аб тулёнскім бунце.

Сход тулёнскіх рабочых арганізацый патрабуе парляманцкага расьсьледаваньня падзей.—Хлусьня афіцыйных паведамленьняў аб бунце.

ПАРЫЖ, 4-10. У зьвязку з падзеямі ў Тулёне, галоўны інспэктар марскога міністэрства прыехаў у порт Мальбуске, каб дапытаць зьняволеных там 80 матросаў. Матросы спаткалі яго сьпевам Інтэрнацыяналу.

На сходзе, дзе прысутнічалі прадстаўнікі тулёнскае біржы працы, прадстаўнікі сацыялістычнае фэдэрацыі дэпартаманту Вар, прадстаўнікі ўсеагульнае і ўнітарнае канфэдэрацыі працы, камуністычнае партыі, камуністычнага саюзу молодзі, проціфашысцкае гвардыі і г. д., была ўхвалена пастанова скласьці камісію, каб расьсьледаваць падзеі ў Тулёнскім вайскова-марскім астрозе і абсьледаваць умовы, у якіх знаходзяцца вязьні. Сход перадаў для абвяшчэньня ў друку паведамленьне, у якім патрабуе, каб дазнаньне, назначанае ўрадам, ня было даручана вайсковай уладзе. Далей сход дамагаецца, каб парляманцкая камісія па марскіх справах прыехала ў Тулён для дазнаньня і каб камісія выслухала дэлегатаў сходу; паведамленьне дадае, што ў выпадку нездаволеньня гэтых пунктаў прадстаўнікі арганізацый, якія ўдзельнічалі ў сходзе, зьвернуцца да грамадзкае думкі, каб яна зрабіла належны нажым.

«Юманітэ» выкрывае недпраўдзівасьць абодвых афіцыйных паведамленьняў ураду, зазначаючы, што першае паведамленьне прыпісвае паўстаньне крымінальным злачынцам з мэтаю дыскрэдытаваць паўстаўшых перад грамадзкаю думкаю; між тым, на справе засуджаныя за крымінальныя злачынствы выключаюцца з флёту і перадаюцца пад загад цывільнае адміністрацыі і ніколі ня трымаюцца ў вайскова-марскіх астрогах. Другое афіцыйнае паведамленьне завярае, нібыта харч, які выдаваўся экіпажу на крэйсэры «Эрнэст Рэнан», быў дабраякасным. Між тым, 18-га ліпеня ўвесь экіпаж атруціўся гнілым мясам.

Вайсковы мяцеж у Мэксіцы.

МЭКСІКА, 4-X. За паўстаньнем у часьцях гарнізону мэксіканскае сталіцы, водлуг чутак, адбыліся такія-ж паўстаньні і ў іншых мясцовасьцях, між іншым у штаце Веракруц. Урад завярае, што рух ня мае сур'ёзнага значэньня. Трывожныя чуткі набываюць упарты характар.

Проці паўстаўшых выслана войска ўраду і самалёты. Тэлеграфныя і тэлефонныя зносіны з Веракруцам перарваны.

Меншавікі сарвалі стачку трамвайшчыкаў

БЭРЛІН, 4-10. Кампраміс, прапанаваны сацыял-дэмакратычным трэцейскім судзьдзёю рабочым і служачым бэрлінскіх гарадзкіх чыгунак, абвешчан міністэрствам працы абавязковым для абодвых бакоў. У зьвязку з гэтым кіраўнікі прафсаюзаў заявілі, што прафсаюз не падтрымае забастоўкі.

Наступны дэлегацкі сход выказаўся проці абвяшчэньня забастоўкі большасьцю 52-х проці 45-ці.

Заваёва ангельскіх рынкаў таварамі СССР

ЛЁНДАН, 4-10. Кансэрватыўная «Дэйлі Экспрэс» паведамляе, што ў параўнаньні з жніўнем 1926 году ўвоз у Англію з СССР павялічыўся ў жніўні г.г. на 302.194 фунты стэрлінгаў, вываз-жа з Англіі ў СССР зьменшыўся на 95.199 фунтаў стэрлінгаў, а зваротны вываз—на 695.843 фунты.

Зьвяртае на сябе ўвагу, піша газэта, што наперакор упартай кампаніі некаторых колаў проці ўвозу савецкіх тавараў і продажу ў Англіі савецкае нафты, увоз з СССР у Англію ўсё-ж павялічыўся.

За дзень.

Французкія правакацыі.

У нядзелю тэлеграмы паведамлялі аб тым, што францускі габінэт міністраў ухваліў патрабаваць ад нас адкліку т. Ракоўскага з пасады пасла СССР у Парыжы. Да гэтага часу кіруючыя колы Францыі яшчэ не адхілілі гэтае паведамленьне афіцыйнага тэлеграфнага агэнцтва «Гаваса».

Учора гэтае-ж самае агэнцтва «Гавас» афіцыйна абвясьціла гутарку пасла Францыі ў СССР Эрбэта з т. Чычэрыным, у якой быццам Францыя патрабуе адкліку Ракоўскага. У паведамленьні зазначаецца, што гэтая гутарка адбылася 2-га кастрычніка г. г.

Гэтае-ж агэнцтва ў гэты-ж дзень друкуе паведамленьне аб тым, што т. Чычэрын ад імя СССР згадзіўся на адклік т. Ракоўскага.

Паміж тым ва ўіх гэтых паведамленьнях няма ані слова праўды, бо ніякай гутаркі 2-га кастрычніка паміж т. Чычэрыным і Эрбэтам ня было, гэтаксама т. Чычэрын ніколі не згаджаўся на адклік т. Ракоўскага.

Зусім слушна, што ўсе гэтыя паведамленьні «Гаваса» маюць сваёй мэтаю правакаваць нас на разрыў з Францыяй, належным чынам узьніць грамадзкую думку Францыі, што ў разрыве павінна ня столькі французкая рэакцыя, колькі СССР, які быццам нават не зацікаўлен у тым, каб французкі ўрад перагледзеў гэтае пытаньне. Мусім адзначыць, што ўсе гэтыя правакацыйныя выступленьні французкага афіцыйнага тэлеграфнага агэнцтва нічыльна зьвязаны з прыездам у Парыж нафтавага караля Дэтэрдзінга, на грошы якога вядзецца супроцьсавецкая кампанія ва ўсёй французкай прэсе.

Габінэт міністраў Францыі павінен быў ужо даўно пераканацца ў тым, што СССР на правакацыю ня пойдзе, гэтаксама як нікому ніколі ня ўдасца захапіць нас зьнянацку.

Пасьля Сватоу.

Рэвалюцыйнае войска прымушана было пакінуць Сватоу. Слабыя і раздробленыя атрады рэвалюцыйнае арміі не змаглі ўтрымаць у сваіх руках Сватоу, на які распачалі наступ белыя арміі контр-рэвалюцыйных генэралаў як з Кантону, так і з Нанкіну. Абкружаныя з усіх бакоў, слаба ўзброеныя атрады Хо-Люна і Іе-Ціна адступілі для таго, каб праравацца ў цэнтр партызанскага руху.

Характэрна тое, што рэвалюцыйнае войска адступіла ў парадку, бяз ніякае панікі і бяз ніякіх адзнак разгрому. Асноўныя балвыя сілы рэвалюцыйнае арміі захаваліся, яе жывая сіла не разгромлена, але абкружаная з усіх бакоў контр-рэвалюцыйнымі арміямі яна прымушана адступіць для таго, каб далучыць да сябе партызанскія сялянскія атрады і аднаўленымі сіламі зноў кінуцца ў бойку.

Зварочвае на сябе ўвагу паведамленьне ангельскіх газэт аб тым, што рэвалюцыйная армія абкружана „белым контр-рэвалюцыйным войскам". Гэтая характарыстыка дае досыць яснае ўяўленьне, як глыбока пайшло распластаньне ўнутры кітайскае рэвалюцыі, што нават замежныя газэты прымушаны сазнацца, што войска Холюна і Іе-Ціна ёсьць войска чырвоных, рэвалюцыйнае, а кантонскае і нанкінскае гэта—белае, контр-рэвалюцыйнае. Міма гэтага факту ніяк прайсьці ня можам.

Гэта значыць, што, не зважаючы на адступленьне з Сватоу і на некаторы правал наступленьня на Кантон, усё-ж ня можа быць і ніякіх гутарак аб тым, што рэвалюцыйнае войска страціла сваё значэньне на агульным фоне разгортваньня падзей у Кітаі.

Адзін другога варты.

Польскія палітычныя партыі розных напрамкоў ужо пачалі рыхтавацца да новых выбараў у Сойм і Сэнат. Урадавая і поўурадавая прэса вельмі рэзка выступае проці прэсы эндэцкай і імкнецца даказаць, што бяда Польшчы ў тым, што на яе лёс мелі і маюць часамі ўплывы эндэкі. Эндэкі ў свой чарод даказваюць, што ўсё гора Польшчы ў тым, што ёю кіравалі і кіруюць такія няпэўныя ў палітыцы асобы, як Пілсудзкі і яго прыхільнікі.

Па пытаньнях польскай палітыкі ў Заходняй Беларусі гэтыя палітычныя ворагі таксама закідаюць адзін аднаму розныя палітычныя праступленьні. Эндэкі вінавацяць пілсудчыкаў за іх фэдэрацыйныя імкненьні, якія па перакананьні эндэкаў павінны прывесьці к адарваньню Заходняй Беларусі ад Польшчы. Пілсудчыкі на гэта адказваюць, што якраз эндэцкая палітыка адносна беларусоў і іншых нацыянасьцяў прывядзе да таго, што Зах. Беларусь адарвецца ад Польшчы, бо эндэцкая Польшча імкнецца задушыць заходніх беларусоў усякімі спосабамі.

У працэсе «прынцыповых»

У ПАНСКАЙ ПОЛЬШЧЫ.

Суд над камуністамі.

У Познані закончыўся судовы працэс проці камуністаў. Суд цягнуўся два тыдні і вынес наступны прыгавор: Ліпскага і Мора прыгаварыў на 2 з пал. гады кожнага, Шалайціса на 1 з пал. гады, Казінскага і Маленскага на 1/2 года.

Узрост дарагоўлі.

Статыстычная камісія выказала ўзрост дарагоўлі ў Польшчы ў працягу верасьня на 0,7 проц. у параўнаньні з жніўнем.

Катастрофы з самалётамі.

Гэтымі днямі самалёт Лігі паветранай абароны «Іскра», які браў удзел у прапагандовых лётах у Влацлавку, упаў на вуліцу Касьцюшкі гэтага гораду. Апарат значна пацярпеў. Лётчык К. Корчак астаўся цэлым. На другі дзень гэты лётчык вылецеў на новым апараце «Голіат» і ізноў упаў у 5 клм. ад Влацлавску. Апарат разьбіўся.

Пілсудзкі і польская работніцкая моладзь.

«Газ. Варш. Поранна» (№ 272) піша, што «у мінулую нядзелю ў Любліне адбыгаўся мітынг пэпэсаў, на якім, між, іншым прамаўляў пасол В. Маліноўскі. Канчаючы прамову, ён крыкнуў: «Няхай жыве Пілсудзкі!» Пэпэсаўская моладзь, якая перапоўніла залю (быў «дзень сацыялістычнай моладзі») адказала на гэта крыкамі. «Няхай жыве дыктатура пралетарыяту!»

Зьезд т-ва бел. школы ў Вялейцы.

14 кастрычніка г. г. у Вялейцы адбудзецца павятовы зьезд сяброў т-ва бел. школы. Парадак зьезду наступны: 1. Справаздача акружнае ўправы; 2. Даклады з месц; 3. Плян будучай працы; 4. Бягучыя справы.

ЛІКВІДАЦЫЯ ПОЛЬСКІХ ШКОЛ У ЛІТВЕ.

Польская прэса абураецца рэпрэсыямі літоўскага ўраду проці польскага школьніцтва, у рэзультаце чаго апошняе амаль зусім будзе зьліквідавана.

Калі весткі польскіх газэт праўдзівыя, дык абураньне такімі мерапрыёмствамі фашысцкага літоўскага ўраду зусім зразумела; але польскаму грамадзянству пры гэтым ня трэба забываць, што ў сваёй дзяржаве яна ўжо даўно зьліквідавала амаль ня ўсе беларускія школы і шмат літоўскіх і тым дало літоўскім фашыстам добры прыклад.

Францыя і Вэнгрыя ў 1920 годзе.

(Цана падтрыманьня Польшчы).

Уся Вэнгрыя жыве пад уражаньнем сэнсацыйнага выкрыцьця, якое датычыць палітычных падзей так няшчаснага дзеля Вэнгрыі 1920 году. Чым дзеля Нямеччыны зьяўляецца Вэрсальскі трактат 1919 году, тым ёсьць дзеля Вэнгрыі Трыанонскі трактат, падпісаны 4-га чэрвеня 1920 году. Гэты трактат зафіксаваў зруйнаваньне былое велічы Вэнгрыі; ён блізка ўтрая зьменшыў насельнасьць і больш як падвойна—абшар Вэнгрыі, адразаючы яе ад мора і зводзячы яе да трэцярадных эўрапейскіх дзяржавак. Трыанон у вачох вэнгерскіх нацыяналістаў стаў сыноніам вялікага нацыянальнага няшчасьця і паніжэньня, і як у Нямеччыне імкненьне да перагляду Вэрсальскага міру ахапляе ўсё болей шырокія колы насельнасьці, гэтак вэнгерскія нацыяналісты ўсё болей голасна дамагаюцца перагляду Трыанонскага міру.

Дзеля гэтага ўсякае выкрыцьцё закулісное страны дыплёматычных перагавораў перад падпісаньнем гэтага міру выклікае і мусіць выклікаць пэрвознасьць сярод нацыяналістычнае вэнгэрскае буржуазеі. А тут здарылася выкрыцьцё сапраўды сэнсацыйнае, і ўся Вэнгрыя загудзела, як патрывожаны вулей.

28-га верасьня газэта „Мэдзьярзаг" апублікавала поўнасьцю французкую ноту ад Вэнгрыі 15-га красавіка 1920 году, блізка за два месяцы перад падпісаньнем Трыанонскага міру. У ноце абгаварваліся ўступкі, якія маглі быць зроблены Вэнгрыі ў мірным трактаце, калі-б яна далучылася да Польшчы і выступіла-бы проціў савецкіх рэспублік.

Дзеля гэтага, памянёная нота мае цікавасьць і для нас—беларусаў, якім 1920 год таксама вельмі балюча і надоўга даўся ў знакі. Нота наглядна паказвае, за якія сродкі гатова была тагды ўхапіцца французкая буржуазея, каб дапамагчы Польшчы, а пры больш шчасьлівым разгартаньні падзей і зусім зламаць ненавісную ёй савецкую ўладу. Нота наглядна паказвае таксама фальш і крывадушнасьць імпэрыялістаў Антанты, якія ў працягу вайны крычалі, што змагаюцца за вызваленьне малых народаў, а тут згаджаліся заплаціць вэнгерскай ваеншчыне за выступленьне проціў саветаў—застаўленьнем над Вэнгрыяй значных абшараў з украінскай і румынскай насельнасьцяй.

Нота падпісана тагочасным генэральным сэкратаром французкага міністэрства замежных спраў Морысам Палеолёгам, які раней быў французкім пасланьнікам пры расейскім царскім урадзе. Нота трэбавала ад Вэнгрыі выставіць стотысячную армію на дапамогу Польшчы проціў савецкіх рэспублік і на час трываньня ваенных апэрацый перадаць вэнгэрскія чыгункі пад загад французкае дырэкцыі.

Французкі ўрад браў на сябе ўзбросьнае выстаўленае армії, дзеля чаго прызначаліся запасы венскага арсэналу.

Узамен за гэта Вэнгрыя мела бы граніцы, блізкія да гэтагодніх прапаноў лёрда Ротэрміра, нагнаўшых столькі страху на малую Антанту. Паміж іншым, Вэнгрыі былі-б пакінуты месты Кашаў, Унгвар, Мункач, Чатмар, Гросвардэйн, Арад, Марыя-Тэрэзія Оцэль і Чамбор разам з вакольнымі абшарамі. Апрача таго, нота абяцала Вэнгрыі плебісцыт у іншых сумежных з Румыніяй мяйсцовасьцях, аўтаномію некаторых мяйсцовасьцяў, ўерахсдзіўшых да Румыніі, вольнасьць мовы і рэлігіі дзеля вэнгерскае нацменшасьці ў Румыніі, агульную амністыю, зварот забранае сыравіны, прапарцыянальную раскладку фінансавых забавязаньняў быўшае аўстра-вэнгерскае імпэрыі і па заканчэньне ўсяго зьяцьце віны за выкліканьне вайны.

Пасьля апублікаваньня гэтае сапраўды сэнсацыйнае ноты вэнгэрскія нацыяналісты надзялі шум, дамагаючыся ад ураду поўнага высьвятленьня прычын, чаму такі спрыяючы дзеля Вэнгрыі выпадак застаўся нявыкарыстаным і хто ў гэтым вінаваты.

Газэта «Мадзьярзаг", публікуючы ноту, зазначыла, што тагачасны вэнгэрскі ўрад так доўга цягнуў з адказам, пакуль выслана яму ў Польшчу французкаму генэралу Вэйганду ўдалося рэарганізаваць польскую армію, якая адна патраціла адбіць наступ Чырвонае арміі, пасьля чаго французкі ўрад забраў назад сваю прапанову. На гэта з урадавых вэнгерскіх колаў паведамілі, што французкая нота была напісана 15 красавіка 1920 г., а ўжо 6 мая вэнгерскі ўрад атрымаў умовы Трыанонскага міру з трэбаваньнем даць адказ на іх не пазьней 17 мая, а 4 чэрвеня адбылося самае падпісаньне міру. У гэтым часе на савецка-польскім фронце было яшчэ параўнаўча ціха, а рашучая бітва пад Варшаваю адбылася ў сярэдзіне жніўня, так што французка-вэнгерскае паразуменьне сарвалася зусім ня ў зьвязку з шчасьлівым дзеля Польшчы паваротам ваенных падзей.

Трое быўшых сяброў тагачаснага вэнгерскага ўраду выказалі тры розныя вэрсыі справы. Быўшы старшыня ўраду Сімоні-Сэмадам заявіў, што ўрад разглядаў французкую ноту і адказаў поўнаю згодаю, аб чым была паслана афіцыяльная нота французкаму ўраду. Тым часам у Францыі адбылася зьмена ўраду, і новы ўрад адмовіўся ад прапаноў Палеолёга. Быўшы міністр Блейэр заявіў, што самае ноты ён ня бачыў, але яна разглядалася радаю міністраў, прычым ніякае пастановы прынята ня было. Другі быўшы міністр Бэнард заявіў наадварот, што нота Палеолёга ніколі не паступала на разгляд рады міністраў.

Такім чынам, гісторыя з нотаю Палеолёга і невыкарыстаньнем яе тагачасным вэнгерскім урадам застаецца яшчэ цёмнаю. Насоўваецца пытаньне: які сэнс мае апублікаваньне гэтае ноты іменна цяпер і чаму вэнгерскія нацыяналісты трэбуюць адказу ад сучаснага ўраду? У венскіх газэтах выказваецца такая думка, што апублікаваньне ноты ёсьць ходам правадыра партыі «вэнграў, што прачынаюцца», Тыбера Эктарда,—проціў міністэрства замежных спраў і самаго старшыні ўраду—графа Бэтлена, які таксама меў нейкае дачыненьне да справы.

Якія вынікі будзе мець дзеля ўнутранае вэнгерскае палітыкі гісторыя з нотаю Палеолёга—нам усёроўна. Але што антантаўскія імпэрыялісты гатовы былі заплаціць вэнгерскай ваеншчыне за выступленьне проці саветаў украінцамі і румынамі, гвалтычы нібы-та прызнаныя імі правы нацыяў на самавызначэньне,—гэта мае значэньне і для нас.

м. с.

Матч Капабланка—Алёхін.

БАЭНОС-АЙРЭС. Адкладзеная 8-ая партыя матчу Алёхін—Капабланка скончана ў нічыю пасьля 42-га ходу.

Крызіс польскай дзяржаўнасьці.

Манархічнае «Слово» адразу пасьля апошняга роспуску сойму напісала артыкул пад сэнсацыйным загалоўкам: «Няхай жыве манархія», у якім рэзка крытыкавала сучасны дзяржаўны ўстрой Польшчы і выхваляла роспуск сойму.

З лёгкай рукі «Слова» сталі пісаць на тэму аб дзяржаўным устроі Польшчы, аб сойме і канстытуцыі і ўсе іншыя польскія газэты. Гутаркі і пісаніна на тэму аб крызісе дзяржаўнага ўстрою Польшчы зрабіліся цяпер у Польшчы моднымі.

Трэба прызнаць, што да гэтага важнага пытаньня ў Польшчы падыйшлі неяк раптам, неспадзявана, выпадкова, толькі дзякуючы апошняму роспуску сойму. Праўда, у сувязі са склікам сайму амаль ня ўсе партыі сталі рыхтавацца да бою з урадам Пілсудзкага, які па іх перакананьні гвалціць канстытуцыю, зусім ня лічыцца з соймам і імкнецца да дыктатуры.

Сойм у цэлым ня думаў, каб Пілсудзкі рашыўся на безадкладны роспуск яго. Панам паслам здавалася, што Пілсудзкі пачакае. Аднак, Пілсудзкі не захацеў чакаць і распусьціў сойм. Факт гэты паслужыў тэмай для таго, каб паставіць пытаньне: які дзяржаўны ўстрой у Польшчы і ці існуе канстытуцыя? Амаль ня ўсе газэты, за выключэньнем урадавых органаў, выказаліся ў тым духу, што Польшча перажывае дзяржаўны крызіс і што ўрад выяўляе ўсе прызнакі фашызму.

Суміруючы гэтыя паасобныя погляды на сэнс крызісу дзяржаўнага ўстрою Польшчы, пасол М. Недзялкоўскі прыходзіць на старонках «Роботніка» да такіх вываду:

„Пад адным поглядам, піша ён, трудна адмовіць у слушнасьці цьвярджэньняў нашых манархістаў; момант, які перажываем цяпер у Польшчы, не зьяўляецца толькі крызісам парляментарызму. тым менш крызісам сучаснага сойму, мы знаходімся ў стане крызісу цэлага ўстрою дзяржавы".

І пэпэсаўскі пасол М. Недзялкоўскі пытаецца:

1) якая форма праўна-палітычнага ўстрою Польшчы дае найбольш даных для памысной ліквідацыі капіталізму па карысьць сацыялістычнай гаспадаркі"?

2) „Якая форма праўна-палітычнага ўстрою дае найбольш шансаў для ўтрыманьня і замацаваньня Польшчы, як незалежнай дзяржавы?»

Адказ такі:

„Пры нашым географічным палажэньні паміж Саюзам Савецкіх рэспублік і Нямеччынай, з прычыны існаваньня фашыстаўскіх і камуністычных імкненьняў у польскім грамадзянстве —мы (пэпэсы. Рэд.) бачым спасеньне ў парляментарнай дэмакратыі.

Перад Польшчай вырасла пытаньне, як яна мае быць з'арганізавана. Манархізм, камунізм, фашызм, дэмакратыя, амэрыканская сыстэма? Польшча можа існаваць у сучасных сваіх межах толькі, як дэмакратыя".

Такім чынам, пэпэсы ў асобе п. М. Недзялкоўскага выказываюцца за «парляментарную дэмакратыю», якая па сутнасьці зьяўляецца замаскаванаю формаю буржуазнай улады. Ведаючы гэта, пэпэсы ўмысна затуманіваюць вочы шырокім масам словамі, увесь сэнс якіх азначае панаваньне польскага абшарніцтва, ксяндзоўства і паогул буржуазеі, якія пры гэткай «дэмакратыі» атрымліваюць у свае рукі ўсе законныя сродкі для змаганьня проці рабочых і сялян.

Пэпэсы скрываюць тое, што пры гэткай «дэмакратыі» польскае сялянства, якое складае 70 проц. усяго жыхарства, палітычна знаходзіцца пад пераважным уплывам духавенства і пад матар'яльным уціскам абшаранікаў, якія то праз касьцёл, то праз адміністрацыю, то іншымі сродкамі трымаюць сялянства і нават частку рабочых у сваіх руках, экспляатуюць іх і матар'яльна, і маральна, і палітычна.

Пэпэсы на словах гавораць, што палітычны балаган, якім фактычна зьяўляўся польскі парлямант, можа якімсьці цудам ператварыцца ў установу, дзе фактычным гаспадаром будуць польскія рабочыя і сяляне; што польская буржуазея дабрахоць адмовіцца ад барацьбы за сваё панаваньне над слаба падгатаванымі ў палітычным сэнсе масамі.

Толькі такімі наіўнымі поглядамі на справу можна тлумачыць веру пэпэсаў у «парляментарную дэмакратыю», асабліва ў Польшчы, дзе ўплывы абшарнікаў і капіталістаў на жыцьцё «парляментарнай дэмакратыі» адчуваецца вельмі моцна.

Сам-жа «Работнік» за дзень да артыкулу п. Недзялкоўскага напісаў аб уплывах абшарніцтва на дзяржаўную адміністрацыю, а праз яе і на ўвесь дзяржаўны ўклад Польшчы:

„Просім уявіць сабе палажэньне старасты ў якім-небудзь павеце, у якім ёсьць маёнткі графа ці князя—удзельніка Нясьвіжу або Дзікава. Прыпусьцім далей, што гэты староста выпадкова ні майёр, ні капітан, а толькі звычайны бюракрат. Што думае ўрад, чаго хоча Пілсудзкі—староста ня ведае. Затое ведае, што граф сустракаецца з высокапастаўленымі прыяцелямі маршалка ,што граф еў абед у Нясьвіжы, часта думае аб графе, як госьцю Бэльвэдэру і т. п.

Трэба мець цьвёрды характар, каб рыпыкаваць змагацца з графам з-за якой небудзь мясцовай дробязі. У арыстакратычных колах Варшавы і Кракава голасна гаворыцца: „о, каля мяне адміністрацыя скача".

Абшарніцкая арыстакратыя навялічыла свой уплыў на правіцыяльную адміністрацыю. У той самы час слабее даверʼе да гэтай адміністрацыі з боку сялян і работнікаў".

Вось якія кветачкі расквітаюць у Польшчы пры існаваньні ў ім дэмакратычнага парлямантарызму, за які гарой стаць польскія сацыялісты, накшталт М. Недзялкоўскага, які, паміж іншым, і сам зьяўляецца абшарнікам і «гуляе», забаўляецца ў сацыялізм і парлямантарную дэмакратыю. А яго таварышы па абшарніцкаму стажу ня «гуляюць», а робяць рэальную справу: зьяжджаюцца на зьезды, агітуюць, паразумяваюцца з Пілсудзкім і голасна крычаць: «Няхай жыве манархія».

Зразумела, што апрача гэтых двух палітычных полюсаў: манархістаў і сацыялістаў, у Польшчы ёсьць яшчэ шмат, нават зашмат іншых легальных палітычных напрамкаў, якія заблытваюць агульную палітычную сітуацыю да таго, што ў ёй цяжка разабрацца, і дзякуючы чаму складасьцца бязвыхаднае для Польшчы палажэньне.

Пілсудзкі спрабаваў «маральна аздаровіць» Польшчу, г. ё. выцягнуць яе з балота прадажнага палітыканства і замяніць уладу парлямантарнай дэмакратыі, г. ё. розных палітычных напрамкаў буржуазныя думкі сваёю асабістаю ўладай—спачатку замаскаванай, а цяпер і зусім ужо яўнай дыктатурай. Але і гэты экспэрымэнт ня толькі ня вывеў Польшчу на шлях нармальнага жыцьця, а яшчэ больш заблытаў упутраную сітуацыю. Польшча знаходзіцца цяпер на раздарожжы. «Дэмакратычны парлямантарызм» прывёў Польшчу да ўнутранага раскладу. Дыктатура Пілсудзкага, якая хацела-б «маральна аздаровіць» польскае жыцьцё, яшчэ больш яго замуціла. Выхад з заблытанай палітычнай сітуацыі для Польшчы адзін: скончыць з панаваньнем буржуазеі і яе прадстаўніцтвам—парлямантарызмам, на грунце якога вырасла і дыктатура адзінкі.

Толькі дыктатура пралетарыяту і бяднейшага сялянства ўтворыць у Польшчы здаровую сітуацыю, якая ўнемажліўіць росквіт фашызму і вывядзе Польшчу з хранічнага стану бясконцых дзяржаўных крызісаў.

М. Лучаніц.

У САЮЗНЫХ РЭСПУБЛІКАХ.

ПАРТЫЙНЫЯ МАСЫ АБУРАНЫ ЎЧЫНКАМІ АПАЗІЦЫІ.

УДАРЫЦЬ ПА КІРАЎНІКОХ ДЭЗАРГАНІЗ. ПРАЦЫ.

ХАРКАЎ, 4-Х. Партыйныя ячэйкі Харкава далучыліся да пастановы МКК, ЦКК і выканкому Камінтэрну і патрабуюць ад ЦК партыі самае нашчаднае барацьбы з апазіцыяй.

Пленум партыйнай камісіі Украінскага ваеннага округу лічыць, што ЦКК пабальшавіцку вырашыла пытаньне аб барацьбе з апазіцыяй, ужыўшы рашучыя захады ў дачыненьні да апазіцыянэраў—арганізатараў падпольнай друкарні. Пленум просіць ЦКК ужыць рашучыя захады барацьбы таксама і з ідэёвымі натхнічэлямі і кіраўнікамі дэзарганізатарскае працы.

Зьніжшыць фракцыйнасьць да 15-га зьезду.

СТАЛІН, 4-Х. Партыйны сход усіх заводзкіх і гарадзкіх ячэек з абуреньнем зазначае, што ў адказны момант апазіцыя, замест дапамогі партыі, праводзіць далей сваю фракцыйную, проціленінскую барацьбу. Сход вітае пастанову ЦКК УсеКП(б) у адносінах удзельніцаў нелегальнае друкарні і выканкому Камінтэрну аб выключэньні Троцкага і Вуйёвіча з сяброў выканкому Камінтэрну. Сход патрабуе, каб да 15-га зьезду партыі была спынена ўся фракцыйная праца.

За выключэньне злосных апазіцыянэраў.

ДНЕПРАПЯТРОЎСК, 3-Х. Аб'яднанае пасяджэньне бюро акругкому і прэзыдыуму акрКК поўнасьцю далучаецца да пастановы прэзідыуму ЦКК УсеКП(б) аб выключэньні з партыі групы раскольнікаў, якія зьвязаліся ў працы проці партыі з буржуазнымі контр-рэвалюцыйнымі элементамі.

Пасяджэньне патрабуе выканаць пункты 6-ты і 7-ы рэзалюцыі 10-га партзьезду аб адзінстве, у асобку, лічыць немагчымым пакідаць надалей у партыі т. т. Прэабражэнскага, Серабракова і Шарава, якія ўзялі на сябе палітычную адказнасьць за арганізацыю падпольнае проціпартыйнае друкарні.

Проці падпольнікаў у партыі.

КІЕЎ, 4-Х. Пашыраны пленум Студнёўскага райпарткому цалкам адобрыў пастанову ЦКК аб апазіцыянэрах.

Пленум Сталінскага райпарткому далучыўся да пастановы прэзыдыуму ЦКК і выканкому Камінтэрну аб выключэньні Троцкага і Вуйёвіча з выканкому Камінтэрну і патрабуе, каб ЦККК ужыла рашучыя захады проці ідэёвых натхнічэлеў і кіраўнікоў падпольных мэтадаў барацьбы проці партыі.

ТАВ. БРУХАНАЎ АБ ПАЗЫЦЫ ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫІ,

РАСТОЎ н-Д. Сёньня праз Растоў праехаў наркамфін СССР тав. Бруханаў.

У гутарцы тав. Бруханаў заявіў: «Галоўнае, што трэба памятаць пры рэалізацыі пазыкі індустрыялізацыі, гэта ні ў якім выпадку не дапушчаць прымусовага распаўсюджаньня. Задачы, якія ставіць перад сабою пазыка, даволі ясныя для кожнага рабочага і селяніна, і адно гэта можа цалкам забясьпечыць посьпех яе распаўсюджаньня. Выпушчаная пазыка індустрыялізацыі ў сучасны момант для нашага краю мае ня толькі эканамічнае, але і вялічэзнае палітычнае значэньне, абумоўленае неабходнасьцю паказаць імпэрыялістычнаму сьвету, што ўсе ўнутраныя рэсурсы нашага краю ў патрэбны момант могуць быць рэалізаваны і сабраны для ажыцьцяўленьня задач індустрыялізацыі.

Пасьпешная і хуткая рэалізацыя пазыкі ў разьмеры намечаных 200 млн. р. дасьць магчымасьць ураду бесперабойна весьці працу на тых грандыёзных пабудовах, як Днепрастрой, Туркестанская чыгунка, завод сельска-гаспадарчых машын ў Растове, трактарны завод у Сталінградзе і г. д.»

Посьпех пазыкі забясьпечан.

ЦЬВЕР. За тыдзень рабочыя і служачыя тэкстыльных фабрык „Пралетарка" і „Вожканоўка" падпісаліся на пазыку індустрыялізацыі на 118 тысяч руб. Па некаторых аддзелах фабрык рабочыя і служачыя падпісваюцца на пазыку УСІМ КАЛЕКТЫВАМ НА 100 проц.

* * *

РАСТОЎ-ДОН. 4 дні падпісні на пазыку індустрыялізацыі далі ў ленінскіх чыгуначных майстэрнях 20 тысяч руб. Ёсьць выпадкі падпісні на 50-100 руб. два рабочыя—Аўчараў і Еўданімаў падпісаліся: першы на 225 р., другі на 200 руб.

387 міліёнаў на сельскую гаспадарку.

МАСКВА. Наркамфін СССР падсумаваў бюджэтныя выдаткі на сельскую гаспадарку Саюзу. Па кантрольных лічбах 1927-28 г. бюджэтныя адлічэньні на сельскую гаспадарку дасягаюць 387 міліёнаў рублёў і будуць у паўтары разы больш даваенных (1913 г.).

17-проц. рост прампрадукцыі.

МАСКВА, 4-Х. Старшыня ВСНГ СССР Куйбышаў зьвярнуўся да Саюзных Рэспублік і галоўных кіраўніцтваў ВСНГ СССР з дырэктыўным лістом, як складаць прамфінплян на 1927-28 г. Абульны абхват капітальнае працы вызначан у суме 1.176 млн. руб. Прырост прадукцыі чакаецца ў размеры 17 проц. проці леташняга году. Рост прадукцыйнасьці працы запраектаваны ў разьмеры 13,8 пр. пры павялічэньні ліку рабочых на 2,3 проц.

Падарунак Кастрычніку.

ЦЬВЕР. У дзень 10-годзьдзя Кастрычніку на рэчцы Соша будзе закладзена вялікая гаць і распачнецца пабудова новае воднае электрастанцыі Тургінаўскага прэдытнага таварыства. Станцыя дасьць сьвет для шмат якіх вёсак Цьверскага павету.

Польскі шпіёнаж на Украіне.

КІЕЎ, 4-Х. Надзвычайная сэсія Камянецкага акруговага суда скончыла разгляд справы 50 удзельскае банды, якая займалася шпіёнажам на Украіне.

У 1924 годзе пры выкрыцьці органамі ДПУ шпіёнскае арганізацыі, галоўныя ўдзельнікі яе Янэк Глувінскі і Скубскі ўцяклі ў Польшчу, дзе паступілі на службу ў дэфэнзыву. Па заданьні апошняе яны арганізавалі на савецкай тэрыторыі шпіёнскую сетку. Сваіх агэнтаў яны нербавалі ў Праскураўскай і Камянецкай акругах. Аднаму з шпіёнаў Базылю Аляксейка было даручана атруціць студні, адкуль чырвонаармейцы пагранічнае варты бралі ваду.

Надзвычайны суд засудзіў галоўных шпіёнаў да растрэлу. Рошта засуджана да зьняволеньня ў астрозе на 5-10 гадоў з высылкай пасьля адсідкі за межы Украіны.

Савецкія матацыклісты вярнуліся з прабегу.

МАСКВА, 4-Х. 4-га кастрычніка ў 5 гада. 40 хв. увечары ў Маскве на пляцу імя Сьвердлова адбыўся фініш прабегу матацыклістаў Масква-Парыж-Масква. Усе машыны прыбылі ў добрым парадку. Савецкія пакрышкі і часткі да матацыкляў аказаліся добрае якасьці і вытрымалі прабег.

Адбыўся мітынг. Камандор прабегу т. Гіммэльфарб, адказваючы на прывітаньні, сказаў: ва ўсіх заходніх капіталістычных краёх рабочыя спаткалі нас ня толькі як савецкіх спартсменаў, але і як прадстаўнікоў адзінага ў сьвеце краю, дзе ўлада знаходзіцца ў руках рабочых і сялян.

Тав. Гіммэльфард перадаў прадстаўніку Массавету чырвоны сьцяг, перададзены яму рабочымі Берліну для Маскоўскага Савету.

Па Беларускай ССР.

(Ад нашых карэспадэнтаў).

Актыўнасьць узрастае.

На райённым зьезьдзе сялянак разьвязаны наступныя галоўныя пытаньні аб міжнародным і ўнутраным становішчы СССР, справаздача райённага выканаўчага камітэту, выбары дэлегатак на акруговы зьезд работніц і сялянак. На райённы зьезд сабраліся тыя жанчыны-сялянкі, якія паступова ўцягваюцца ў актыўную працу па кіраваньню дзяржаваю, бо амаль што ўсе пытаньні і спрэчкі па дакладу аб міжнародным і ўнутраным становішчы СССР сьведчылі аб павялічыўшайся палітычнай сьвядомасьці сялянак. Напрыклад, задавалі такія пытаньні: «Ці добра мы падрыхтованы, каб даць адпор нашым ворагам; якія ў нас узаемаадносіны з прыбалтыцкімі дзяржавамі; што робіцца ў Кітаі; чаму Англія, хоця і разарвала дыплёматытныя ўзаемаадносіны з намі, але прадаўжае гандляваць і г. д.». У спрэчках адна жанчына, між іншым, зусім правідлова адзначыла, што мы наконт васнізацыі шмат гаворым, але мала робім практычнага ў вёсцы па лініі Асавіяхіму, арганізацыі санітарных гурткоў і г. д.

Прынятыя рэзалюцыі цалкам адбіваюць дзелавы характар работы зьезду; аб тым, што зьезд праходзіў у дзелавой і зацікаўленай з боку ўсіх сялянак атмасфэры сьведчыць тое, што спачатку зьезду (зьезд адчыніўся а 1 гадз. дню) і да шостай гадзіны ўвечары ніводная жанчына не пакінула працы зьезду.

На акруговы зьезд работніц і сялянак абраны шэсьць жанчын, з іх: членаў сельскіх саветаў 4 (у тым ліку адна сэкратар савету), членаў райвыканкому адна і адна кандыдатка Менскага акрвыканкому. Н.

Узьдзенскі р., Меншчына.

АКРУГОВЫ ЗЬЕЗД ЖАНЧЫН-ЧЛЕНАЎ САВЕТАЎ.

ГОМЕЛЬ, 5-Х. У Гомелі адчыніўся першы акруговы зьезд жанчын-членаў саветаў.

Делегаткі зьезду ў часе знаёманьня па зьезьдзе наведаюць буйнейшыя прадпрыёмствы, музэй Луначарскага і аэрадром. Магчыма, што некаторым ім будзе зроблена «паўстранае хрышчэньне».

У Доме Наркамасьвены, дзе адбываюцца пасяджэньні зьезду, адчынены выстаўкі па ваеннай справе і па ахове мацеры і дзіцяці, а таксама выстаўлены дыяграмы і плякаты, малюючыя становішча народнае асьветы. Дэлегаткам будут выдадзены білеты ў тэатр Калініна і паказана кіно-карціна «Аборт».

12500 ЧАЛ. ЗЬЛІКВІДУЮЦЬ СВАЮ НЯПІСЬМЕННАСЬЦЬ.

Бабруйск, 5-10. З першага кастрычніка пачалі працаваць лікпункты гораду, па райёнах жа заняткі адчыняцца з 15 кастрычніка. У гэтым годзе лікпункты акругі ахопяць 12500 чалавек няпісьменных, галоўным чынам, сялян.

НОВАЯ С.-ГАСПАДАРЧАЯ ШКОЛА.

Віцебск, 5-Х. Адчыняецца сельска-гаспадарчая школа па гадоўлі і перапрацоўцы лёну і канаплі. Школа адчыняецца ў 8-мі кілёматрах ад Віцебску ў савецкай гаспадарцы «Лужэсна». Курс навучаньня 3-хгадовы. Школа дае права (пасьля 2-хгадовага практычнага стажу) на паступленьне бяз экзамену ў с.-г. акадэмію.

РАСПАЧАЛАСЯ КАЛЕКТЫЎНАЯ ЗДАЧА ПАДАТКУ.

Бабруйск, 5-10. Па даных, на 3 кастрычніка па ўсёй акрузе паступіла 30000 руб. сельска-гаспадарчага падатку. Весткі з месц гавораць аб тым, што селянства пачало здаваць падатак калектыўна.

ДАРОСЛЫЯ ІМКНУЦЦА Ў ШКОЛУ.

Полацак, 4-10. Сёньня пачаліся іспыты новаступаючых у вячэрнюю школу павышанага тыпу, а таксама прыём і ў іншыя вячэрнія школы. Назіраецца вялікі наплыў моладзі і дарослых, жадаючых вучыцца. З 7 кастрычніка пачынаюцца заняткі.

КА ДНЮ СЬВЯТ БУДУЦЬ ВЫПУШЧАНЫ НОВЫЯ ГАЗЭТЫ.

Гомель, 4-10. Саюз харчавікоў да дню сьвяткаваньня Кастрычнікавай рэвалюцыі выдае газэту, у якой будуць надрукаваны матар'ялы, малюючыя дасягненьні саюзу за 10 год. Новабеліцкі райком КП(б)Б таксама выпускае райённую друкаваную газэту-ужо праведзен сход рабкораў і выдзелена рэдкалегія.

ЗЬЕЗДЫ ЖАНЧЫН-ДЭЛЕГАТАК.

ГОМЕЛЬ, 4-10. Па ўсіх райёнах акругі закончаны райённыя зьезды жанчын-дэлегатак, членаў саветаў. Гэтыя канфэрэнцыі прайшлі жвава, выступаўшыя сялянкі адзначалі дасягненьні і недахваты ў працы, далі наказ аб узмацненьні ўцягненьня сялянак у працу сельсаветаў і інш. На канфэрэнцыях былі абраны дэлегаткі на акруговы зьезд жанчын-членаў саветаў, які адбудзецца 5 кастрычніка ў доме Наркамасьветы. Заканчваецца ўся арганізацыйная праца па правядзеньню зьезду. Некаторыя работніцы фабрык і прадпрыёмстваў арганізоўваюць урачыстае спатканьне дэлегатак.

ПАСЕЎНАЯ КАМПАНІЯ ПРАЙШЛА З ПОСЬПЕХАМ.

Гомель, 5-Х. У час васеньняй пасяўной кампаніі прачытана сялянству больш 72 дакладаў на прадпасеўныя тэмы. Ачыстка пасеньня прайшла вельмі добра. Па пляну меркавалася ачысьціць 14800 п., а ачышчана 19765 п. —абслужана больш 1000 гаспадарак. Заложана 24 паказальныя вучасткі. Зараз праводзіцца ўзмоцненая падрыхтоўка да дню ўраджаю.

АДМІНІСТРАЦЫЯ НАСЬЦЕНГАЗЭТЫ НЯ ЧЫТАЕ.

(Гомельшчына).

Пасьценгазэта Гомельскай п.-т. канторы, ня гледзячы на летні перыяд і водпускі, выходзіла рэгулярна адзін раз у м-ц. Рэдкалегія пасылае пасьценгазэту ўсім п.-т. аддзяленьням акругі на прагляд. Па мясцох працаўнікі вельмі цікавяцца газэтай. Кепска толькі, што яны ня пішуць у яе, а матар'ялу ў іх можна знайсьці шмат. Але адміністрацыя саўсім ня лічыцца з газэтай і ня чытае яе.

— Некалі чытаць,—вось яе адказ.

Пара адвыкнуць ад гэтай прывычкі.

Свой.

1917 год НА МАГІЛЕЎШЧЫНЕ.

Пасьля Карнілава.

I. Кардонны меч

Адгучэла карнілаўшчына, вышаў з падпольля Магілеўскі савет рабочых і салдацкіх дэпутатаў і разгарнуў вялікую працу.

Што ні дзень—нарады, аб'яднаныя і неаб'яднаныя, агульныя шматлюдныя сходы.

Што ні дзень—спатканьні, даклады Керанскаму, пісаныя і вусныя, сумесная праца з «вярхоўнай сьледчай камісіяй па выяўленьню абставін карнілаўскай змовы», сумесная праца з камісарам часовага ўраду пры стаўцы—Вырубавым (прызначаным замест Філаненка).

Амаль ня кожныя 5-6 дзён у Магілеў прыяжджаюць старшыня міністраў Керанскі і вайсковы міністр Вярхоўскі.

Шуміць, гудзіць Магілеў, гасьцінна штодзень прымае цэлыя атрады каранданэнтаў сталічных і замежных пэрыядычных выданьняў, зьбіраючых тут матар'ял па ліквідацыі карнілаўшчыны.

Шуміць, гудзіць Магілеў, трасе кардонавым мячом па адрасу рэакцыі наогул і зьвіўшай сабе гняздо ў стаўцы ў прыватнасьці.

— Мы самым рашучым чынам выкарчуем з арміі контр-рэвалюцыйныя элементы!—катэгарычна заявіў вайсковы міністр прадстаўнікам мясцовай дэмакратыі 6 верасьня 1917 году (даты старога стылю) на пэроне станцыі Магілеў, дзе стаяў цягнік Керанскага.

Тое самае прыблізна, але ў больш гарачай экзальтаванай форме заявіў прэм'ер-міністр Керанскі спатыкаючым яго прадстаўнікам арганізацый: Выканкому, Савету, Губсавету сялянскіх дэпутатаў, Усерасейскага вайсковага саюзу, зьезду авіяцыі, армейскага камітэту пры стаўцы, саюзу чыгуначных рабочых і служачых і інш.

А камісар часовага ўраду пры стаўцы Вырубаў на надзвычайным пасяджэньні савету рабочых і салдацкіх дэпутатаў заяўляе:

— Рука міністра Керанскага ня здрогне, яна будзе дзейнічаць рашуча і энэргічна.

II. Лыжка дзёгцю.

Ёсьць гэткае трапнае прыслоўе: «Лыжка дзёгцю псуе бочку мёду». А ў гэтым выпадку ў бочку мёду ўліта было да таго-ж не адна лыжка дзёгцю, а цэлых дзьве, прычым вінавайцай сапсаваньня ўсяго мёду зьяўляецца той-жа савет.

Сталічны і маскоўскі друк, прадстаўнікі якога, як мы ўжо казалі вышэй, у верасьні 1917 году сіднем сядзелі ў Магілеве, абслугоўваючы адгэтуль выданьні, прадстаўнікамі якіх яны зьяўляліся,—штодзень паведамляў аб поўнай рэарганізацыі ўсяго апарату стаўкі, зьмяшчэньні амаль ня 9/10 усяго афіцэрства, аднаўленьні зьверху да нізу і г. д. і г. д.

Тут, здавалася-б, толькі радавацца савету гэткай рэкляме вынікаў яго чынасьці, а ён раптам агаласіў у сваім афіцыёзе аб фальшывасьці ўсіх паведамленьняў сталічнага друку.

Падаём з газэты «Млот» ад 8 верасьня 1917 г. наступныя гістарычныя дакументы:

**«Выканаўчы камітэт Магіл

Жыцьцё і праца асьветніка.

Усеагульнае абавязковае навучаньне ў Менскай акрузе.

ШТО ДА ГЭТАГА ЧАСУ ЗРОБЛЕНА.

Праца па ўвядзеньню ў Менскай акрузе ўсеагульнага абавязковага навучаньня разгортваецца.

20-га верасьня г. г. прэзыдыум акруговага выканаўчага камітэту заслухаў і зацьвердзіў дадатковы сьпіс мясцовасьцяй, у якіх уводзіцца абавязковае навучаньне. Такім чынам, разам з раней зацьверджаным сьпісам, абавязковае навучаньне дзяцей 8-мігадовага ўзросту уводзіцца ў г. г.—Менску, Барысаве і Чэрвені, ва ўсіх мястэчках акругі і ў вёсках у наступным ліку: **Заслаўскі райён у 104 вёсках, Самахвалаўскі—90 вёсках, Астрашыцка-Гарадзецкі—88 вёсках, Койданаўскі—74 вёсках, Чэрвеньскі—67 вёсках, Магойскі—46 вёсках, Халопеніцкі—46 вёсках, Сьмілаўскі—43 вёсках, Смалявіцкі—37 вёсках, Вузьдзенскі—36 вёсках, Бягомльскі—13 вёсках, Пухавіцкі—10 вёсках, Грэскі—10 вёсках, Капыльскі—6 вёсках, Барысаўскі—5 вёсках.**

Для ўсіх дзяцей 8-мігадовага ўзросту гэтых пунктаў цалкам забясьпечана месца ў школах. Праўда, сьпіс гэтых школ невялікі. Для гэтай справы з усяго ліку школ Менскай акругі (991) мабілізавана ўсяго 273 школы, з іх 39 гарадзкіх сямігодак, 38 райённых сямігодак, 10 чатырохкамплектавых школ, 9 трохкамплектавых, 105 двухкамплектавых і 72 аднакамплектавых.

Усе гэтыя школы ў большасьці маюць уласныя памяшканьні, добрае і выстарчаючае абсталяваньне, моцны кадр настаўніцтва і забясьпечаны на 90 проц. падручнікамі і пісьмовымі прыладамі.

Крыху нездавальняюча стаіць пытаньне з дапамогай бяднейшым вучням. Яны, пакуль цёпла, у школу наведваюцца, але ў халодную пару і вялікія маразы могуць быць настаўлены перад фактычнай немагчымасьцю наведваць школу.

З мэтай дапамогі такім дзецям у раённыя каштарысы ўнесены нязначныя сумы (150 руб.). Зразумела, што гэта кропля ў моры тэй матар'яльнай незабясьпечанасьці, перад якой стаіць вясковая моладзь: грошай гэтых далёка ня хопіць.

НЕАБХОДНА ШЫРОКАЯ ГРАМАДЗКАЯ ДАПАМОГА.

Дзяржава цалкам забясьпечыць вучняў пакуль што ня можа, таму трэба навокал гэтага пытаньня разгарнуць грамадзкую ініцыятыву.

Увесь цяжар працы па правядзеньню ўсеагульнага абавязковага навучаньня на мясцох ускладаецца на спэцыяльныя камісіі па ўсеагульнаму навучаньню.

20-га верасьня прэзыдыум акруговага выканаўчага камітэту зацьвердзіў інструкцыю аб працы названых камісій. У г. Менску арганізуецца 8 такіх камісій: у зьвязку з чым г. Менск разьбіт на 8 райёнаў, у г. Барысаве—2 такіх камісіі, адна ў Нова-Барысаве, другая ў старым горадзе.

У Менску ўстаноўлены наступныя райёны: Камароўскі (6, 14, 19, 23 і дасьледчая сямігодкі), Пярасьпянскі (13, 15, 28 і 34 сямігодкі), Інтэрнацыянальны (1, 17, 18, 26, 30 і 32 сямігодкі), Ляхаўскі (2, 5, 7, 22 і 24 сямігодкі), цэнтральны (4, 8, 10 і 11 сямігодкі), прывакзальны (3, 9, 12, 27 і 33 сямігодкі), Акцябрскі (31, 35, усе шэсьць чыгуначных школ), Серабранскі (29 сямігодка).

У склад камісій уваходзяць усе загадчыкі школ райёну, прадстаўнікі ад прадпрыёмстваў, ад гарадзкога савету, ад ячэек ЛКСМБ, ад таварыства саматужнікаў, ад бацькоў вучняў, ад таварыства «Прэч нянісьменнасьць» і «Прыхільнік дзяцей». У сельскіх мясцовасьцях у склад камісій уваходзяць усе сёльскія культурныя камісіі сельскіх саветаў, загадчыкі школ, прадстаўнікі ад каапэрацыі, ад таварыства «ПН» і «ПД», ад бацькоў вучняў, ад камітэту сялянскае ўзаемадапамогі.

Галоўная задача камісій—гэта шырокае вывучэньне сям'і дзіцяці і ўсіх асаблівасьцяў яе жыцьця. Ясна, што пры гэтым выявіцца і сацыяльны склад, і матар'яльнае становішча, і ўзрост дзяцей.

Рэгістрацыя дзяцей 8-мігадовага ўзросту, згодна абавязковай пастановы АВК, па школах ужо скончана.

Праводзіцца арганізацыя камісій па ўсеагульнаму навучаньню як у гарадох, так і па райёнах. Пасьля іх афармленьня будзе зроблена праверка дзяцей, якія зарэгістраваліся ў школах і якія дагэтуль незарэгістраваліся і школы не наведваюць. Па выяўленьні дзяцей, якія не наведваюць школу і пасьля высьвятленьня прычын ненаведваньня, па бацькоў тых дзяцей, якія ўпарта не пасылаюць сваіх дзяцей ў школу, а магчымасьць моюць, будуць накладзены адміністрацыйныя пакараньні за парушэньне абавязковай пастановы АВК. На камісіі ўскладаецца абавязак адшуканьня сродкаў для дапамогі бяднейшым вучням вопраткай і абуткам, арганізацыяй гарачых сьнеданьняў у часе заняткаў у школах, начлежак і падвозу дзяцей з далёкіх вёсак у выпадку завеі і ў распуціцу.

Зразумела, што бяз шырокай грамадзкай ініцыятывы і дапамогі з боку насельніцтва камісіі значнай дапамогі такім дзецям ня зробяць, а дзяржаўныя фонды на гэты прадмет пакуль што слабыя.

Неабходна ўцягнуць у гэту працу шырокія грамадзкія колы, настаўніцтва, арганізацыі і таварыствы.

Увядзеньне ўсеагульнага абавязковага навучаньня насельніцтва і настаўніцтва вітае, як аб гэтым гавораць на райённых настаўніцкіх канфэрэнцыях, бацькі на сходах па школах і г. д. Але разам з тым заўважваецца нейкая нерашучасьць і затрыманы тэмп працы ў правядзеньні ўсёй справы з боку сельскіх саветаў і райённай інспэктуры.

Адчуваецца патрэба ў правядзеньні па райёнах аб'яднаных нарад старшынь с-саветаў і старшынь культкамісій з мэтай інструктаваньня іх.

Сустракаюцца перашкоды з устанаўленьнем узросту дзяцей. Тут патрэбна абавязковая пастанова АВК аб тым, каб бацькі мелі на руках адпаведныя дакументы аб узросьце сваіх дзяцей. Гэтыя справаўкі ахвотна і дарэмна выдаюцца райённымі выканаўчымі камітэтамі, але насельніцтва само слаба варушыцца.

Заняткі ў большасьці школ распачаліся з 15 верасьня і, дзякуючы абавязковай пастанове, заўважваецца вялікі наплыў дзяцей у школы, асабліва 8-мігадовага ўзросту.

С. Шыёнак.

Занадта спагадлівы народ.

(Нібы фэльетон).

Аб тым, што барысаўскія асьветнікі вясёлы народ, пісалася ўжо ня раз. Аказваецца, што яны ня толькі вясёлыя, а яшчэ спагадлівыя.

«Лаўры» вясёлых людзей, відаць, не даюць ім спакою, а таму час ад часу яны лічаць ня лішнім напомніць аб сваім існаваньні...

— Што-ж яны яшчэ парабілі,—спытаецеся вы?

Бачыце, пасьля ліквідацыі акруговых устаноў засталося шмат беспрацоўных канцэлярыстых, а ў тым ліку і сяброў саюзу працасьветы.

Аслабанілася таксама з пару пасад дзеловодаў у сямёхгодках, і вы думаеце былі прызначаны сябры свайго саюзу?

Вось у тым та і справа, што не...

Скажам, 3-й школе сямёхгодцы быў патрэбен дзеловод, дык...

Ці вінавата тут крэўная сувязь, ці звычайна любоў да людзей з весам, а толькі...

Прызначаюць сына пябожчыка пратапопа, сябра другога саюзу, а сваім беспрацоўным прадастаўляецца поўнае права атрымоўваць дапамогу ў страхкасе і чакаць каля мора надвор'я...

Гэтае яшчэ-б нічога, але старшыня гаррайкому саюзу, націраючы ад здаваленьня рукі, казаў пры гэтым,—«Ну, дзякуй савецкаму богу: т. Ф. «устройли»...

Дабра, таварышы, займайцеся «будаўніцтвам»,—сапраўды, трэба-ж што небудзь рабіць, а толькі, ці ня занадта вы спагадлівыя людзі?

Бо ад вашай спагадлівасьці беспрацоўныя сябры саюзу асьветы сыты ня будуць.

В. Зайцаў.

„Парадачкі" ў нашым доме асьветы.

(Ворша).

— Слухайце, цётка, дайце чыстую навалачку на падушку, прастыню і пададдзеяльнік, а то тут зусім брудныя. Ажно страх класьціся.

— Кладзецеся так як ёсьць, бо ў нас больш няма...

— А чаму ў вас тут у абнічажыцьці такі смурод і па кутках навукі кросны паспавалі аж сыплецца на галовы?...—адказвае па гэта цішыня...

— У вас клюб для начуючых асьветкаў ёсьць?

— А як жа, вунь праз калідор, толькі ён па вечарох замкнён на ключ.

— А як-жа туды зайсьці пачытаць газэту?

— Якую газэту, у нас газэты чытаюць толькі служачыя дому асьветы і акрана ў асобным габінэце.

— А ці ёсьць у вас шашкі альбо шахматы.

— Ёсьць, але іх ня выносім у чытальню, бо яны ў нас адны і заўсёды заняты кім-кольвек з інспэктароў акрана ці служачых дому асьветы.

Ня верыце, то паглядзіце, толькі праз вакно ў калідоры, бо, бачыце, начальства ня любіць, каб ім перашкаджалі і зачыняецца.

— Дык пакажэце хоць што там за клюб і ці варта плаціць сяброўскія ўзносы на яго ўтрыманьне.

Адчыняюць, гляджу, стаіць у кутку піяніна, стол, з дзесятак лавак. На сьценах дыяграмы пэрыяду 1920-24 г. Гляджу далей, шукаю вачыма насьценную газэту, пазнаў па загалоўку і ня хочацца верыць сваім вачам. Мае яна наступны выгляд: загаловак «Думка асьветніка», далей фатаграфія прафгуртка і расьпісан яго жыцьцяпіс—яго сацыяльны склад і г. д. Ня ведаю, мо' каб прыглядзеўся, нашоў-бы, колькі сябры прафгуртка ў дзень ядуць і колькі сьпяць, але я ня шукаў, бо тэхнічка не дала доўга разглядаць—выгнала, баіцца, мусіць, кабеціна, каб «начальства» не сварылася.

Іду назад пад канвоем тэхнічкі і разважаю: «Думка асьветніка»... ня верыцца мне, каб асьветнікі так ужо больш ні аб чым і ня думалі, як аб Аршанскім прафгуртку пры доме асьветы. Адным словам, парадачкі! Цікава, ці бачыць іх акрпраўленьне працасьветы.

Падарожны.

Піанэррух у сыстэме народнай асьветы.

У праекце „сыстэмы" народнай асьветы т. Баліцкім вызначана ў асноўным правільнае мейсца ў піанэрскім руху, калі ня лічыць некаторых практычных недакладнасьцяй. Другое гаворыць у сваім артыкуле т. Ант. Лёсік („Савецкая Беларусь" ад 29-5 1927 г.), дзе ён зусім не праўдзіва навальваецца на піанэрскую арганізацыю.

Ніхто ня можа адмаўляць з працаўнікоў па народнай асьвеце, што піанэрскі рух ішоў увесь час уперадзе школы, ён даваў зарадку школе. Галоўнымі паказацелямі могуць быць хаця бы мэтады іх працы, іх самадзейнасьць, іх актыўнасьць.

Апошні год піанэрскі рух неражываў некаторыя цяжкасьці. Гэтыя цяжкасьці піанэрскай арганізацыяй упарта перамагаюцца. Узяць хаця-бы пяперашнюю працу па мэтаду праектаў, альбо як у атрадах называюць—па мэтаду заданьняў. У нашай школе тут яшчэ ня скора прыдзецца распачаць работу, але гэта зрабіць трэба будзе. Піанэрскі рух зарадку даў. Хто можа адмаўляць, што піанэрская арганізацыя была і ёсьць галоўным арганізатарам дзетвары; хто можа адмаўляць, што піанэрскі рух зьяўляўся галоўным у барацьбе з старымі адносінамі настаўніцтва да вучняў—пануваньне, рукапрыкладзтва і розныя другія кары.

Мусіць не напрасна калегія Сацвыху НКАсьветы, абгаварваючы працу піанэрскай арганізацыі вясной 1927 г., кажа: „дзіцячы камуністычны рух у БССР за кароткі час абхапіў звыш 85.000 удзельнікаў. Высока падняў актыўнасьць дзяцей, заваяваў аўтарытэт сярод працоўных, падняў культурны ўзровень і палітычны інтарэс дзяцей, зацікавіў іх жыцьцём новае школы і паказаў ім далейшы шлях—у шэрагі камсамолу. Піанэрская арганізацыя, апрача таго, выявіла сябе як новая культурная сіла, уносячая рэвалюцыйны струмень у грамадзкі быт, у сям'ю, у савецкую школу".

Адмаўляцца ад усяго гэтага—значыць адмаўляцца ад фактаў, значыць ня ведаць што рабіла і робіць піанэрская арганізацыя. Сказаць гэта—значыць сказаць, напрасна існуе піанэрская арганізацыя.

Відома, некаторым настаўнікам, якія яшчэ не разумеюць выхаваўчага значэньня самага існаваньня арганізацыі, якім піанэрская арганізацыя па сваёй сутнасьці зьяўляецца ненавіснай, былі і будуць супроць яе існаваньня. Многія яшчэ і сёньня ніяк ня могуць зразумець, што ў тэй школе, дзе існуе піанэрская арганізацыя—настаўніку працаваць лепш, ён мае большыя посьпехі ў працы.

* * *

— „Бяз сталага кіраўніцтва клюбную працаю (разумеецца працаю атраду М. А.) піанэры трацяць многа часу зусім без карысьці для сябе; гэта вядзе да таго, што пясьняховаясьць піанэраў у школьнай працы бывае меншая ў параўнаньні з пясьняховаясьцю клясы". Зусім напросна т. Ан. Лёсік думае, што няма ніякага кіраўніцтва атраднаю працаю, што дзеці толькі марнуюць час, а пасьля гэтага адстаюць у школьнай вучобе.

Ня ў гэтым зусім справа. Справа ня ў кіраўніцтве. Дзеці ў піанэрскай арганізацыі дарам час ня трацяць, аб гэтым паказана вышэй. У вучобе адстаюць ня больш астатніх дзяцей. Узяць хаця-б 4 школу (гор. Менск), у якой піанэраў налічваецца 243 чал., непасьпяваючых з іх было ў першым трыместры—39, а у астатні час году непасьпяваючых ня было. У 9 школе піанэраў не пасьпявала 6,6 проц., а непіанэраў—11,1 проц., у 8 школе піанэраў не пасьпявала 10,5 проц., а непіанэраў—11,9 проц. і толькі ў 5 школе піанэраў адстае 13,6 проц., а непіанэраў—10,7 проц. Напрасна пакліёны наводзіць непатрэбна, а трэба гаварыць аб тых непармальнасьцях, якія існуюць—гэта аб пяўвязцы працы школы ў піанэрскіх атрадах. Вот аб чым трэба гаварыць, а не аб кіраўніцтве.

Пры пяперашніх умовах увязаць працу зусім немагчыма, а піанэр павінен вясьці працу і ў атрадзе і ў школе.

Патрэбна правесьці пераўкамплектаваньне школ і атрадаў па тэрытарыяльна-вытворчаму прынцыпу,—гэта дасьць магчымасьць зьнішчыць многаатраднасьць у школах і прыцягнуць школу да вытворчасьці. Наша-ж школа цяпер з вытворчасьцю ніякае сувязі ня мае, што вельмі шкодна адбіваецца на азнаямленьні дзетвары з працоўнымі працэсамі, [адрывае дзяцей ад працы іх бацькоў, ад грамадзкіх арганізацый, бо ўсе яны (грамадзкія арганізацыі) пабудаваны па тэрытарыяльна-вытворчаму прынцыпу.

* * *

І далей у сваім артыкуле Лёсік піша: «часта можна назіраць, што тыя клясы, у якіх многа піанэраў, ня толькі не падтрымліваюць дысцыпліну ў часы клясных заняткаў, а нават самі яе большасьцю парушаюць».

У школе піанэры не такія ўжо непісцыплінаваныя, як здаецца т. Лёсіку. Ёсьць выпадкі, але ня можна іх адносіць агульна да ўсёй піанэрскай арганізацыі, уяўляць піанэраў сьмірнымі дзяцьмі, прама анёламі—ня можна, бо яны ўсётакі дзеці, узрост іх ня можа «сьмярдзець мертвячынай".

Што разумее Лёсік пад дысцыпліна-насьцю, цяжка разумець. Калі разумець пад дысцыпліна-ванасьцю страх вучняў перад настаўнікам, каб пры ўваходзе настаўніка ў клясу ўсе замерлі ад страху, як ад прыходу ў клясу калісьці (у старыя часы) інспэктара, то выбачайце, у нас такое дысцыпліны ніколі ня будзе і мы яе ня будзем складаць. **Нам патрэбна дысцыпліна сьвядомая, дысцыпліна бяз усякага нажмыму, дысцыпліна, якая складаецца калектывам вучняў, пры дапамозе настаўніка і па яго ініцыятыве.**

Такую дысцыпліну піанэрская арганізацыя складае, вядзе за яе ўпартую барацьбу, дапамагае настаўніку ў складаньні такое дысцыпліны.

Правіла, якое А. Лёсік жадае правесьці ў жыцьцё каб піанэрнаводыр быў абавязкова настаўнік—пажадана, але зрабіць немажліва. Мы павінны гаварыць лепш аб набыцьці павадырамі пэдагагічных навыкаў, аб падрыхтоўцы агульнай асьветы, што цяпер і робіцца.

А. Лёсік прапануе застанавіць кіраўніка і павадыра фарпосту. Кіраўніком павінен быць настаўнік, а павадыром—каго высуне камсамольская ячэйка, павадыр павінен зьявіцца намоцнікам кіраўніка. Гэтая прапанова мае такі сэнс, які мы ўжо даўно адхілілі. Гэта спрэчкі адносна таго, хто павінен кіраваць піанэррухам — камсамол, альбо школа. Лічым лішнім спрачацца па гэтаму пытаньню, бо ў пастановах XIII зьезду РКП(б) ясна гаворыцца: што тычыцца арганізацыйных форм руху, то партыя павінна кіраваць і праз ЛКСМ, які ў сваю чаргу павінен весьці працу ў поўнай пагоджанасьці з органамі сацыяльнага выхаваньня. Фарпост-жа зьяўляецца арганізаванаю адзінкаю піанэрскай арганізацыі ў школе, якою кіруе непасрэдна піанэрская арганізацыя пры дапамозе культурных сіл школы.

М. А—ц.

На варце краіны Саветаў.

Разьвітаньне з Чырвонай арміяй.

Стрэльба і іншыя рэчы зданы ў цэйхаўз. У ленкутку паліткіраўнік раздае «памятку адпускніку».

«Тав. паліткіраўнік я буду вам пісаць аб сваёй працы, а вы давайце саветы», просіць камандзір аддзяленьня.

«А я ўперад пайду ў парт'ячэйку, а потым буду пісаць»—кажа казамолец.

К 9 гадзінам раніцы ўсе сабраліся к штабу палка і дзеловод выдае дакументы. У гаспадарчай часьці выдаюць грошы.

«Ну, пойдзем апошні раз напалудпуем». У 4 гадзіны ўсе ад'яжджаючыя выстраіліся. Куфэркі, кошычкі зложаны на падводу. Музыка чакае каманды.

З клюбу выбягае бібліятэкар палка і нясе апошні падарунак. Кожны атрымаў бібліятэчку.

У розных месцах ідуць апошнія размовы. Адзін дамагаецца, як яму лесу атрымаць, другі пытае якіх кніжак яшчэ трэба яму самому купіць.

Каманда «станавіся» кароценькі мітынг.

«Я чакаў калі ж гэта я паеду дамоў, а цяпер калі трэба ехаць, то ня хочацца ісьці на вакзал», гаворыць адзін з адпускнікоў.

Больш ня далі гаварыць, трэба ісьці.

Музыка зайграла марш. Калённа пайшла.

К. С,

Пераменьнікі свае задачы выканаюць.

Экзамен баявой патрыхтоўкі пераменьнікі 5 палка вытрымалі добра. Аб гэтым сьведчыць тая ацэнка, якую даў камандзір корпуса. Ён сказаў, што 5 полк, у параўнаньні з другімі тэрытарыяльнымі палкамі—**стаіць на першым месцы.** І за добрую вучобу вынес падзяку ўсяму палку.

Учора плошча гораду Чэрвеня, яго вуліцы ўміг пахавалі нядаўніх ваяк пад шэрыя, сівыя і іншага колеру адзежы, бо—гэта апошні дзень іх сёлетняй вайскова-палітычнай вучобы.

Цяпер вінтоўка і іншыя прылады зноў будуць чакаць сваіх «гаспадароў», а пакуль што кожны з іх ідзе дамоў працаваць з плугамі ці каля станка.

Але ці толькі гэтага чакаюць працоўныя ад пераменьніка.

Сучасны момант патрабуе ад кожнага працоўнага грамадзяніна вывучаць вайскова-палітычныя веды.

Пераменьнік павінен ведаць, што ён будзе мець належны посьпех у барацьбе з ворагам тады, калі ён зможа добра павесьці ваенізацыю сярод насельніцтва, дапамагаючы ў гэтым кампартыі і камсамольскай арганізацыі на вёсцы, у горадзе, калі ён будзе актыўна ўдзельнічаць у працы ячэйкі ТДА-Авіяхіму і гурткоў вайсковых ведаў. Гэтыя задачы нашы пераменьнікі выканаюць таксама добра, як і ў час агульных зборaў.

П. Ліхтаровіч.

Гор. Чэрвень.

Фарміруем полк „ТДА-Авіяхіму".

Злучэньне акрсаветаў ТДА і Авіяхіму Бабруйшчыны адбылося 8-га сакавіка г. г. За гэты пэрыяд Бабруйскі акрсавет ТДА-Авіяхіму значна ўзмацніўся, павялічылася сетка ячэек і колькасьць сяброў. У сучасны момант па акрузе налічваецца 239 ячэек, з якіх: фабрычна-заводзкіх—46, сялянскіх—94, савецкіх устаноў—38, вайсковых—32, вучнёўскіх—3, савгаскіх, саматужных і г. д.—26. Сяброў налічваецца—16.000 чал., з іх мужчын—14.464 чал. і жанчын—1536 чал. Па партыйнасьці: сяброў і кандыдатаў КП(б)Б—2226, сяброў і кандыдатаў ЛКСМБ—3896 чал. За гэты час значна выявіўся актыў у нізавых ячэйках, ажывілася дзейнасьць нізавых рэвізійных камісій і кіруючых органаў. Бабруйскі акрсавет ТДА-Авіяхіму наладзіў сувязь з акрсаветам фізкультуры і «Чырвоным Крыжам». Дзеля ажыўленьня працы нізавых ячэек адбылося 4 пленумы старшыні і сэкратароў ячэек, таксама акрсаветам заслухоўваліся даклады ўсіх ячэек.

У сучасны момант ужо маецца 7 авіяхімкаманд і распачата арганізацыя авіяхіматрадаў. Акрамя гэтага, па акрузе маецца 117 гурткоў вайсковых ведаў з лікам сяброў—2574 чал. і 43 стрэлковыя ціры, з якіх 1 агульна-гарадзкі і 42 прымітыўныя пры ячэйках. Маюцца таксама па акрузе 73 куткі ТДА-Авіяхіму. ТДА-авіяхімаўская літаратура маецца пры хатахчытальнях і куткох ТДА-Авіяхіму Гурткі пры гарадзкіх ячэйках вядуць заняткі нармальна і карыстаюцца ўсякімі дапамогамі і прыладамі вайсковых часьцей. У вясковых ячэйках праца гурткоў праводзіцца тэарэтычна. За сакавік—верасень м-ц Бабруйскім акрсаветам ТДА-Авіяхіму сабрана ў фонд «Наш адказ Чэмберлену» да 6000 р.

Пры акрсавеце ТДА-Авіяхіму існуюць наступныя сэкцыі: 1) па вайсковай падрыхтоўцы працоўных; 2) сэкцыя вайскова-хімічнай абароны; 3) сельгаспадарчая сэкцыя; 4) навукова-дасьледчая сэкцыя; 5) сэкцыя агітацыі і прапаганды і 6) па вайсковай падрыхтоўцы працоўных жанчын.

У склад сэкцый, акрамя сяброў савету і прэзыдыуму, уцягнуты вайсковыя спэцыялісты, аграномы, урачы і г. д. Першай сэкцыяй былі праведзены стрэлковыя спаборніцтвы. Акрамя гэтага, праведзена падрыхтоўчая праца па ўдзелу сяброў ТДА-Авіяхіму ў манэўрах Чырвонай арміі і **распачата фармаваньне палка ТДА-Авіяхіму.** Сельска-гаспадарчая сэкцыя арганізавала 1 паказальны вучастак, а агітпропсэкцыяй быў праведзен шэраг лекцый на навукова-папулярныя тэмы

Бабруйшчына **М. А.**

Апошні сход.

Клюб повен. Сёньня № полк сабраўся, каб праводзіць сваіх таварышоў на новую работу, у большасьці на вёску.

Гаворыць камдыв т. Лакціёнаў:

— Ваша роля байца ня скончана. Зьмена шынэлі на сьвітку ня кажа аб тым, што патрэбна забыць вайсковую справу. Вы зьмяняеце толькі месца працы. Што дала вам Чырвоная армія не патрэбна закапваць у зямлю. Працуючы на сваёй гаспадарцы не забывайце грамадзкай працы. Трымайце сувязь з Чырвонай арміяй.

Камандзір палка тав. Паўтаржыцкі ўспамінае, як ён сустракаў 1903 год.

— Мы стараліся навучыць вас, як біцца з ворагам і як працаваць на вёсцы. Шмат з вас прайшлі школу актывістых. Шмат каму з вас прыходзілася сядзець на гаўптвахце, ці адбываць парады, але цяпер вы павінны ўжо ведаць, для чаго ўсё гэта рабілася. Таварышы, вы цьвёрда памятайце, што вы ня зволены з арміі, а адпушчаны ў доўгатэрміновы водпуск.

— Таварышы, зараз мы будзем раздаваць падарункі за вучобу ў летні час,—абвясьціў камісар.

У першую чаргу палучаюць падарункі асобныя часьці, а потым індывідуальна.

5-й роце за 10-кілёмэтравы пераход—пасьценны гадзіньнік.

Туш. «Нядарам хадзілі», шэпча чырвонаармеец з 5-й роты. «Гэта наказ 1905 г.: «Так хадзіць, як мы хадзілі».

Пераходзяць к раздачы індывідуальных падарункаў. Тут ніхто не забыт. У кожнай галіне вайсковай работы ёсьць «першыя».

Лепшым вайскорам Мажэйку і Шульману—палітславар за 3 р. 50 кап.

Падарункі раздадзены. Заўтра 1903 год ідзе дамоў.

С. К.

Работніцы ваенізуюцца

Пры палкавой школе Ж-скага палка арганізаван вайсковы гурток, у які наведваюцца работніцы каробачнай ф-кі імя Клары Цэткін.

Першыя заняткі былі прысьвечаны вывучэньню балвых асаблівасьцяй вінтоўкі і суадносін паміж яе часткамі. Гэтыя веды работніцы ўсвайваюць добра. У апошні час прыступілі да вывучэньня пешага строю. Посьпехі ў аўладаньні вайсковымі навыкамі ў значнай ступені залежаць ад вопытных і ўважлівых адносін кіраўнікоў.

Гомельшчына. **Б. Н.**

Курсы для адпускнікоў.

5 верасьня распачалі сваю працу курсы па падрыхтоўцы нізавых работнікаў дзеля вёскі. Курсы будуць мець тры сэкцыі: каапэрацыйную, савецкую і вайсковую. Усяго на курсах будзе навучацца 60 чал.

Дзеля абслугоўваньня курсаў вылучаны лепшыя працаўнікі палка, а для каапэрацыйнай і савецкай сэкцый даюць лектароў мясцовыя гарадзкія арганізацыі.

Рознымі прыладамі курсы забясьпечаны. Шкода толькі, што яны разьлічаны на кароткі тэрмін—на 52 гадзіны. Ахвота да вучобы ў слухачоў вялікая бо калі запісвалі, дык ахвотнікаў было больш, чым патрэбна. Кожны адпускнік хоча набыць неабходныя веды і перадаць іх вёсцы. Курсы, якія арганізаваны пры нашым палку змогуць даць патрэбны мінімум ведаў, якіх так жадае адпускнік.

Вайскор.

Гор. Н-Барысаў.

Вёска сёньня.

З б. панскіх пакояў—больніца.

У высокіх прысадах, за паўвярсты ад вёскі Сяліба красуецца маёнтак былога пана Віткоўскага.

Добра памятаюць сялібцы і месьцінцы пана Віткоўскага і яго двух сыноў—Гіляру і Яся, якія ў часы грамадзянскай вайны разам з белапалякамі ў сваіх пакоях выпівалі «за здароўе белага арла».

Але... і пан Віткоўскі з сваімі сынамі ўцяклі заграніцу.

Увесь маёнтак перайшоў пад загад Чэрвенскага павятовага выканаўчага камітэту, а пасьля райёнаваньня—да Сьвіслацкага РВК.

Цяпер маёнтак мае іншы выгляд: уся земля надзелена на пасёлкі. Зямлёй, якой карыстаўся адзін дармаедпан, цяпер карыстаюцца 12 гаспадароў-пасёлачнікаў. Больш багацейшыя сяляне ўжо адбудаваліся, а бяднейшым Сьвіслацкае крэдытнае т-ва адпусьціла 600 руб., за якія яны ў хуткім часе кончаць адбудоўваецца.

У пакоях з 1922 году да гэтага году зьмяшчалася пошта. Але-ж, калі ў мінулым годзе сяляне Сялібы і Месьціны пачалі хадатайнічаць перад Сьвіслацкім РВК, каб адпусьцілі будынак над больніцу, то Сьвіслацкі РВК аддаў гэтыя пакоі пад больніцу, а пошту зьмясьцілі ў Сялібе ў меншым будынку.

Рамонт ужо закончан і да 10-й гадавіны Кастрычнікавай рэвалюцыі больніца будзе адчынена.

М. К—ч.

В. Сяліба, Сьвіслацкі р., Бабруйшчына.

Малазямельны працуе на кулака.

Ці-то ўжо такі лёс нашага Хвядося, ці што небудзь іншае, але справа ў тым, што ніяк ён ня можа дабіцца зямельнага надзелу.

Пятнаццаць год сядзіць на чацьвярціне (3 дз. з 7 членамі сям'і, у той час, як другія маюць па 18 дз. і 9 душ сям'і).

Місіючэнка Мікалай Ап. да польскай акупацыі меў 24 дз. зямлі, з іх 6 дз. пасьпеў прадаць, а апошнімі і да сёньняшняга дню карыстаецца, ніхто і ня думае яго «падстрыгчы».

Неяк у 26-м годзе былі аддялі 6 дз. і надзялілі малазямельнага. Селянін пасеяў жыта, маючы надзею, што і спажыве яго. Але нейкім чынам, ці-то залежыла ад старшыні с.-с., ці-то ад каго другога, але факт той, што кулак ізноў зауладаў зямлёй.

А як-жа, думаеце, з тым жытам, што пасеяў Хвядось.

Апошні мусіў зжаць напалавіну з Мікалаем. Працаваў—ды не спажыў. А мясцовыя органы не зьвярнулі на гэта анякае ўвагі.

У чым тут загвазда—ніхто і дагэтуль ня ведае.

Гэтакі.

(В Гарнастаўшчына, Грэскі р.).

Неабходна ўпарадкаваць як найхутчэй лясы мясцовага значэньня.

Летась на нарадзе ўпаўнаважаных лясоў мясцовага значэньня акрамя ўпаўнаважаных было выбрана на ўвесь райён каля 25 лясьнікоў (па 15 р. у м-ц пэнсіі) і 5 аб'ездчыкаў (па 30 р. у м-ц). Яны павінны былі наладзіць разам з упаўнаважанымі добра лясную гаспадарку ў лясох мясцовага значэньня: своячасова адводзіць дзялянкі, перадаць усе невялікія лясы (кудзеркі), якія не дасягаюць аднэй дзесяціны, гаспадарам у асабовае карыстаньне згодна інструкцыі.

Але выйшла наадварот. Скора год кончыцца іхняй службы, а праца імі ня выканана. У сельсавет кожны дзень паступаюць ад сялян заявы на водпуск лесу. Насельніцтва ня можа дачакацца, калі гэта будзе ўдасканалена лясная гаспадарка.

Атрымаў селянін дазвол высечы лесу, патрэбен аб'ездчык, каб адбіць лес, а яго сялянства бачыць адзін раз у 2-3 м-цы і не дачакаўшыся сякуць лес без адбою.

— Непатрэбна, кажуць, шмат гэтых аб'ездчыкаў і напрасна трацяць на іх грошы.

П. М

Прудзішчанскі с.-с., Астр.-Гарадзецкі райён.

Пра „голае балота".

«Голае балота» знаходзіцца за 2 кілёмэтры ад вёскі Каўпыніцы, Начскага с.-с., Крупскага р. На гэтым балоце ў 1916 г. праводзіліся досьледы тарфянікаў. Дзесяціи на 200 ч. шмат прывозілася розных інструмантаў. Усё гэта па прыходзе на Беларусь немцаў было зруйнавана і расьцягнута часткай сялянствам акружаючых вёсак, а часткай тагочаснай уладай.

На гэтай працы мне самому прыходзілася рабіць і бачыць, што зроблена і колькі затрачана сродкаў. Падкрэсьліўшы ўсё гэта, я мушу сказаць, што органам, ведаючым торфараспрацоўкамі, патрэбна было-б заняцца гэтым пытаньнем і на гатовым грунце пачаць распрацоўку торфу.

Хадасэвіч.

Крупскі р.

АНАТОЛЬ ВОЛЬНЫ.

Антон Савіцкі*).

(*Аповесьць*).

Паліцыя шукае вядомага рабаўніка Савіцкага. Савіцкі рыхтуе напад на абшарнікаў Сівагорава і Ямбржыцкага, якія на паляваньні нібы нясумысьля забілі селяніна Загонава. Невядома дзе зьнікае абшарнік Ямбржыцкі. Сівагораў едзе ў горад за дапамогаю тайнай паліцыі. Разам з ім у нупэ, як вывялася, едзе старшыня дзяржаўнай нарады Акімаў, які, даведаўшыся аб злачынствах Савіцкага, абяцае дапамогу з Пецярбургу. Тайная паліцыя дзейнічае ў сваю чаргу. Савіцкі са сваім найбліжшым сябрам Рыгорам ідуць „у рукі паліцыі". „Баль" у Сівагорава. Губарнатарская нарада. Савіцкі ў Сівагорава. Бойка з паліцыяй. Чалавек з Пецярбургу. Нарада тэрарыстаў. Савіцкі вучыць быць непакорнымі. Спатканьне Савіцкага і чалавека з Пецярбургу. Савіцкі зьбірае „дваранскае сабраньне". Здарэньні з паштальёнамі.

Бо, толькі вось выйшаў ён ад пана Ямбржыцкага, толькі ўвайшоў у лес, што пачынаецца адразу за маёнткам, як шлях яму перарэзалі два нейкія незнаёмцы.

— Адкуль? запытаўся адзін з іх.

— А ты сваяк мне, ці што? Чаму я табе павінен адказваць?—філёзофскі паразважаўшы адказаў паштальён.

— У цябе, запытаўся Савіцкі... Адказвай!—загадаў другі з незнаёмцаў...

Вялікія, вялікія кругі паплылі ў вачох паштальёна і раптам гэты незнаёмы падарожнік, якога пазвалі Савіцкім, пачаў расьці і расьці ў вачох паштальёна і нарэшце вырас да такіх разьмераў, што захіліў сабою лес...

— Ну-ну, адказвай, адкуль зараз? запытаўся зноў незнаёмец.

Але паштальён некалькі хвілін ад зьдзіўленьня ня мог адказаць нічога.

— Вось ён, гэты чалавек, перад якім дрыжаць нават паны!—думаў паштальён і з усіх думак яго гэтая была найбольш вялікай і засьцілала іншыя.

— Адказвай!—рэзка загадаў незнаёмец.

Паштальён сабраўся з духам і адказаў:

— Ад Ямбржыцкага...

—Адкуль Ямбржыцкі атрымаў лісты?

— Штамп быў—«канцэлярыі губарнатара»...

Паштальёну захацелася нечым удружыць чалавеку, якога ён паважаў і аб якім столькі чуў... Ён зразумеў, што Савіцкі мабыць тут недарма і, сабраўшы сілы сказаў:

— Там, у Ямбржыцкага і другі пан,—Сівагораў...Яны мяне з браўнінгамі спатыкалі... Дзіўна нешак!.. дадаў паштальён.

— З браўнінгамі кажаш? перапытаўся Савіцкі.

— Так, з браўнінгамі. І вельмі паны чымсьці напалохан

Перад юбілеем Кастрычніка.

Няхай жыве Кастрычнік!

За 10 год пасьля Кастрычнікавай рэвалюцыі нарадзілася новая вёска, якая перамагла старыя дзедаўскія звычаі і вышла на новы гаспадарчы і грамадзкі шлях.

Хто мог падумаць 15 год таму назад, што на зьмену былой неарганізаванасьці вёскі прыдзе **каапэрацыя і таварыствы сялянскай узаемадапамогі**.

Стары царскі ўрад не зьвяртаў увагі на галоўную масу насельніцтва Расеі—на сялянства, якое пакутавала ў сваёй беднасьці і цемры, працуючы на абшарнікаў і капіталістых.

Кастрычнік 1917 г. гэтых абшарнікаў і капіталістых зьнішчыў, вызваліўшы рабочых і сялян ад іх векавога ўціску.

Пасьля канчатковай перамогі працоўнае сялянства атрымала магчымасьць арганізаваным шляхам весьці барацьбу з ранейшай цемрай і беднасьцю.

Сялянства атрымала магчымасьць разам з рабочай клясай прыняць удзел у перабудове нашай вялікай краіны.

Праз каапэрацыю, праз саветы бядняцка-серадняцкія масы вёскі ўзмацнілі сувязь з гарадзкім пралетарыятам і пасьпяхова ідуць да новых дасягненьняў і перамог.

Адначасова з гэтым умовы вёскі выклікалі да жыцьця новыя арганізацыі —**сялянскія таварыствы ўзаемадапамогі**, галоўныя прынцыпы якіх зводзяцца да самадзейнасьці сялянскіх бядняцка-сярадняцкіх мас у агульнай узаемадапамозе пры перабудове вёскі.

Усе мерапрыёмствы, накіраваныя да падняцьня бядняцкай сельскай гаспадаркі шляхам правядзеньня калектыўнай запашкі, працоўнай дапамогі, каапэраваньня, забесьпячэньня насеньнем і інш.—зьяўляюцца часткай тэй вялікай працы, якую распачаў Кастрычнік.

Апошнія гады працы камітэтаў сялянскіх таварыстваў узаемадапамогі наглядна паказалі, што сялянская ўзаемадапамога і яе камітэты, якіх на Беларусі налічваецца 1400, узмацняюцца і даручаныя ім Кастрычнікам абавязкі выконваюцца з посьпехам.

Дык няхай жыве Кастрычнік!

П. Асіпчык.

Падрыхтоўка ў Случчыне.

Райённа-гарадзкая юбілейная камісія была арганізавана ў сярэдзіне верасьня, але сталую падрыхтоўчую працу распачала толькі ў канцы верасьня. У сучасны момант пры ўсіх сельсаветах, прадпрыёмствах і ўстановах гораду складзены юбілейныя камісіі. Усю падрыхтоўчую працу мяркуецца скончыць у працягу кастрычніка. Для прапрацоўкі ўсіх пытаньняў, зьвязаных са сьвяткаваньнем, маюць быць скліканы нарады апоргаў і сэкратароў ячэек гораду і вёскі, культкамісій, клюбных і бібліятэчных працаўнікоў. На ўсіх сялянскіх і рабочых сходах, сходах беднаты з удзелам батракоў, на сходах дэлегатак, прафактыву, партыйных і камсамольскіх сходах будзе праведзена папулярызацыя падрыхтоўкі да Кастрычнікавых урачыстасьцяй.

Прыняты крокі да выяўленьня ўдзельнікаў барацьбы за Кастрычнік і наладжаньня вечароў-успамінаў аб Кастрычнікавым перавароце, выяўленьня і абнаўленьня магіл загінуўшых у грамадзянскай вайне.

У горадзе пры клюбах к гадавіне будуць арганізаваны выстаўкі дасягненьняў за 10 год ва ўсіх галінах, а 30 кастрычніка будзе адчынена сельска-гаспадарчая выстаўка.

У горадзе ў часе сьвяткаваньня адбудзецца адчыненьне 2-хгадовых педагагічных курсаў, працкалектыву дрэваапрацоўнікаў і рабоча-партыйнага клюбу ў новым памяшканьні. На вёсцы к гэтаму часу падрыхтоўваецца адчыненьне некалькіх чырвоных куткоў і закладка новых будынкаў пад школы.

П. К—ч.

Адзначым вялікае сьвята.

У Бялынкавіцкім с-савеце распачалася падрыхтоўка да гадавіны Кастрычніка. Складзена камісія, якая выпрацавала агульны план падрыхтоўкі. Робяцца захады да ўстаноўкі к сьвяту радыё. Прадугледжана таксама направіць вуліцы ў м. Бялынкавічах, што ўжо часткай зроблена. К гадаўшчыне Кастрычніка будуць адчынены два чырвоныя куткі. Падрыхтоўваюцца п'есы, якія будуць пастаўлены ў дні ўрачыстасьцяй.

Вяскор РАК.

КАСТРЫЧНІК АСЬВЯТЛІЎ ВЁСКУ.

За 10 год вёска Пудзіцкая-Слабада (Пуд. р.) зусім зьмянілася. Да Кастрычнікавае рэвалюцыі яна была гняздом п'янства, крадзяжу, няпісьменнасьці. Школы свае ня было. Заможныя сяляне наймалі прыватнага настаўніка для сваіх дзяцей, а бедныя—ня мелі магчымасьці вучыць дзяцей.

Цапор у вёсцы ёсьць свая школа, якая ахоплівае 80 проц. усіх дзяцей. У 1926-27 годзе ў вёсцы працаваў ліпункт, праз які прайшло 25 чалавек. Ёсьць хата-чытальня і бібліятэка.

Пры хаце-чытальні арганізаваны гуртки: драматычны, палітычны і вайсковы.

У вёсцы ёсьць ячэйкі Мопр'у і ОСО-Авіахіму. З 1925 году існуе ячэйка ЛКСМБ, якая кіруе ўсімі культурнымі справамі. Моладзь стала на новы шлях. Заводзіцца шматпольле, сеюцца культурна-тэхнічныя расьліны.

Усе гэтыя дасягненьні даў Кастрычнік, які асьвятліў кашу цёмную вёску.

А. С.

З ЧЫМ СПАТКАЕ СЬВЯТА КОЙДАНАЎШЧЫНА.

Да 10-й гадавіны Кастрычнікавай рэвалюцыі прыстасоўваецца адчыненьне плянавай школы ў вёсцы Паланевічы—цы самай дзяржаўнай мяжы. На гэту школу, акрамя дапамогі з боку сялян, адпушчана 9.000 руб. з райённага бюджэту. Адчыняюцца таксама школы ў вёсках Кліпаўшчыне і Камароўшчыне. Праводзіцца буйны рамонт койданаўскага нардому. Да сьвята Кастрычніка прыстасоўваецца закладка плянавай школы ў вёсцы Кукшавічы. У дні сьвяткаваньня адбудзецца ўрачыстае адчыненьне польскай школы ў вёсцы Путчыне.

На жаночай лініі да 10-й гадавіны Кастрычніка прыстасоўваецца выпуск дэлегатак у Койданове, Негарэлым, Вялікім-Сяле і Путчыне.

Ад лютага да Кастрычніка.

(Хроніка гістарычных падзей).

23 верасьня (6 кастрычніка).

— Адбылося першае пасяджэньне „всероссийского демократического совета", на якім ухвалена наступная рэзалюцыя: „Демократический совет" прызнае ўтварэньне «прednaларамента», перад якім урад абавязан рабіць справаздачы. «Демократический совет» знаходзіць неабходным устаноўленьне фармальнай адказнасьці ўраду перад „предварламентом" і заяўляе, што ўлада можа быць у руках такога ўраду, які карыстаецца давер'ем „предварламента".

— Адбыўся экстраны сход Усерасейскага і Петраградзкага Саветаў Прафсаюзаў, Савету Р. і С. Д., фабр.-зав. камітэтаў і дэлегатаў саюзу чыгуначных рабочых і мясцовых чыгуначных камітэтаў. Ухвалена гэткая рэзалюцыя: „Сход пастанавіў далучыцца да рашэньня Усерас. Ц. С. Праф. С. і П. С. Праф. Саюсаў адкласьці забастоўку да атрыманьня катэгарычнага адказу ад час. ур, і прапануе Ўсер. Савету Прафсаюзаў і УЦВК аказаць рашучае ўзьдзейнічаньне на час. ур., і каб ён у паказаны тэрмін—26 верасьня, даў катэгарычны адказ на патрабаваньні чыгуначных рабочых".

МУЗЭЙНЫЯ КАШТОЎНАСЬЦІ БССР.

Музэйныя ўстановы БССР складаюцца: з Беларускага Дзяржаўнага музэю ў Менску і падпарадкаваных яму аддзяленьняў музэяў у Гомелі, Віцебску і Магілеве.

У бягучы момант Бел. Дзярж. музэй распарадкаван на аддзелы: археолёгічны, нумізматычны, мастацкі, царкоўна-гістарычны, этнаграфічны, яўрэйскі і вайсковай старажытнасьці.

Старасьвецкая Беларусь.

Археолёгічны аддзел зьяўляецца гордасьцю і славай музэю. Тут сабраны капкрэтныя знаходкі на Беларусі палеаліту [старакаменнага веку], адкрытыя археолёгам Пелікарпавічам, у Парэчы на Сожы, каля в. Берды. Знаходкі складаюцца з мамантавых касьцей, груба аббіваных крамнёвых прыладаў, вугольчыкаў—рэшта вогнішча; гэта паказвае на яўныя сьляды чалавека, які жыў там на зямлі побач з мамантам дзесяткі тысяч год таму назад.

Ёсьць даволі калекцый каменнага веку (эоліт): тапары, абухі, малаткі і інш.

Раскопкі курганоў далі музэю шмат знаходак грыўнаў, бранзалетаў, пярсьцёнкаў і інш. Некаторыя знаходкі курганоў сьведчаць аб культуры жыхароў нашага краю за тысячы і больш гадоў таму назад. Тады ўжо ўмелі хораша аздабляць і любіць дробныя рэчы з бронзы і серабра.

Аддзел нумізматычны і старагістарычных грошай налічвае звыш 10 тысяч экспанатаў. Сабраны гэты аддзел выключна з экспанатаў са знойдзеных на Беларусі скарбаў. Манэты гэтыя гавораць аб тым, скуль, якія чужыя таргаўцы і як даўно прыяжджалі ў наш край. Тут ёсьць манэты Грэцыі, Рыму, Сярэдня-Азіяцкія, якія адносяцца да розных часоў, пачынаючы ад 2 веку нашае эры.

Даволі багатая калекцыя манэт сабрана часоў існаваньня Літоўска-Беларускага гаспадарства.

Царкоўна-гістарычны аддзел складаецца выключна з абразоў, пісаных на Беларусі. (Найстарэйшы ўзор абразу гэтага аддзелу абраз прападобнага Ільлі) адносіцца да 1447 г., далей ідуць абразы 16, 17 і 18 ст. ст.

Цікавым зьяўляецца абраз з надпісам: «гэты абраз Пакрова маляваді мужыкі вёскі Шалаўкі: Якуб Кот з Сымонам Варфаламеем году 1750».

Мастацкія каштоўнасьці.

Мастацкі аддзел музэю вельмі абшырны, і ён складаецца з малюнкаў алейнай фарбы на палатне і дрэве, з акварэляў, маляваных на паперы гравюр, скульптур, выкананых на мармуры, бронзе, дрэве і гліне.

Найбольшая зала музэю занята пад новачасное мастацтва Беларусі — мастакоў: Сьлендзіноўскага, Рустэма, Арлоўскага, Урублеўскага, Ясінскага, Шліпановіча і інш.

Старае мастацтва Беларусі прадстаўлена выключна гістарычнымі партрэтамі князёў Слуцкіх-Радзівілаў, ваяводаў Віленскіх, Менскіх і інш.

Другая заля музэю занята арыгіналамі расейскай мастацкай школы: Тропініна, Брулава, Рэпіна, Серава, Макоўскага, Левітана, Айвазоўскага, Ярашэнкі, Сяміградзкага і інш.

Заля старага заходня-эўрапейскага мастацтва мае цікавыя арыгіналы галяндзкіх, нямецкіх, ангельскіх, італьянскіх і францускіх мастакоў.

Этнаграфія Беларусі:

Этнагаафічны аддзел займае найбольшую залю. Тут сабраны мастацкія тканіны, дываны, капы, пасьцілкі, набойкі і інш. Сабрана шмат экспанатаў хатніх рэчаў нашага сялянства і розныя прылады хатняга рамяства, кросны, бёрды, гарнушкі, збаны і інш.

Аддзел сабраў шмат рознай вопраткі: спадніц, сарочак, сьвітак, паясоў з калітамі і шабэтамі.

Яўрэйскі аддзел займае 2 пакоі, у якіх прадстаўлены яўрэйскі быт і мастацтва. Тут сабраны яўрэйскія рукапісныя кнігі на пергаманце, старадрукі, пінкусы (літоўскія), вышыўкі торы і інш.

Апроч таго, пры БДМ знаходзяцца: архіў, дзе сабраны старадрукі, рукапісныя кнігі, зарысоўкі і інш. і бібліятэка, якая складаецца з 2000 томаў прац аб мастацтве археолёгіі, гісторыі і нумізматыцы,

Правінцыяльныя адзяленьні музэю.

Гомельскі музэй складаецца з калекцый мастацкіх рэчаў, сабраных ў палацы б. князя Паскевіча. Там ёсьць высокай вартасьці мармуравыя статуі, габэлены, розныя мэблі, бронза і, урэшце, вялікая колькасьць мамантавых касьцей. Пры музэі ёсьць да 20 тысяч томаў кніг, пераважна на чужаземных мовах.

Віцебскі музэй багаты нумізматычнымі і археолёгічнымі калекцыямі і мае добры этнаграфічны аддзел.

Магілёўскі музэй мае шмат экспанатаў па царкоўнай старасьветчыне, этнаграфічны і фізычныя аддзелы.

Галоўлітбел 24864.

ПАЗЫКУ ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫІ—У ПРАЦОЎНЫЯ ГУШЧЫ.

Саматужнікі павінны падпісацца на пазыку індустрыялізацыі.

Саматужнік і рамесьнік, які адвеку бязьлітасна эксплёатаваўся ліхвяром, багацеем-скупшчыкам і жыў у надзвычайна цяжкіх бытавых умовах, за час савецкай улады вышаў на шырокі шлях прамысловага каапэраваньня. Праз сваю каапэрацыю саматужнік мае досыць наладжаную і шчыльную сувязь з дзяржаўным і каапэрацыйным крэдытам, з дзяржаўнай прамысловасьцю, з рабочай клясай і працоўным сялянствам.

Але ці можна быць задаволеным дасягнутым узроўнем? Не. Працоўныя масы нашай краіны будуюць сацыялізм. Партыя і савецкая ўлада шчыльна падышлі да ажыцьцяўленьня лёзунгу індустрыялізацыі. Дагнаць і перагнаць у прамысловым і тэхнічным напрамку капіталістычныя краіны зрабілася практычнай задачай дню для працоўных Савецкага Саюзу. Саматужна-рамесная вытворчасьць страціць у нас сваё значэньне, калі яна таксама ня пойдзе шпарка і няўхільна па шляху мэханізацыі, індустрыялізацыі. Неабходнасьць далейшага зьніжэньня цэн, патаньненьня сабекошту прадукцыі, палепшаньня якасьці—вымагае вялізных сродкаў для капітальнага пераабсталяваньня і будаўніцтва саматужнай прамысловасьці.

Кожны арцельшчык, кожны саматужнік БССР павінен памятаць, што толькі за два апошнія гады ўрадам БССР адпушчана саматужнай прамысловасьці з дзяржаўнага бюджэту каля поўміліёна рублёў, ня лічачы мільёнаў, якія адпускаюцца ў выглядзе банкаўскага крэдыту. Дзяржава дае саматужнай прамысловасьці нячуваную ў гісторыі дапамогу. Аднак, дзяржаўнай дапамогі далёка не хапае для далейшага пасоўваньня наперад на шляху індустрыялізацыі.

Выпушчаная ўрадам двухсотміліённая пазыка індустрыялізацыі можа напоўніць гэты недахват і вывіцца магутным рычагом сацыялістычнага будаўніцтва Саюзу ССР і ў значнай ступені далейшага разьвіцьця саматужнай прамысловасьці. Вось чаму кожны арцельшчык, кожны сябра ссудна-ашчаднага таварыства, кожны саматужнік, рамесьнік—павінен падпісацца на пазыку.

Да 10-х угодкаў Кастрычнікавай рэвалюцыі кожны саматужнік павінен набыць аблігацыі пазыкі індустрыялізацыі.

Апроч таго, кожная арцель, кожнае таварыства бязумоўна павінна падпісацца на пазыку.

І толькі ў гэтым выпадку, пры ўмовах энэргічнай і шпаркай падпіскі на пазыку індустрыялізацыі саматужнікі і іх каапэрацыйныя аб'яднаньні, **не на словах, а на справе** возьмуць сапраўдны ўдзел у індустрыялізацыі краіны, у будаўніцтве сацыялізму.

Б. Шмэйлін

Рэалізацыя пазыкі.

Супрацоўнікі Белкустпромсаюзу калектыўна падпісаліся на 430 руб.

Служачыя цэнтральнай статыстычнай управы на Ўчарайшы дзень калектыўна падпісаліся на 1.020 руб.

Галоўная каса ашчаднасьці да 4 кастрычніка разам з папярэдняй падпіскай рэалізавала пазыкі індустрыялізацыі на 10.240 руб.

Т-ва ўзаемнага крэдыту за ўвесь час прыняло падпіскі на пазыку індустрыялізацыі на 51.780 руб. Учора толькі за 1 дзень прынята падпіска на 1.000 рублёў.

Усекабанк да 5 кастрычніка прыняў падпіскі на пазыку індустрыялізацыі на суму 3.985 руб.

Учора ў Камунбанку адзін грамадзянін купіў аблігацыі пазыкі на 600 руб., заплаціўшы за іх налічнымі грашыма. Усяго-ж Камунбанк дагэтуль рэалізаваў на 1925 руб.

Віцебск.

Некаторыя калектывы яшчэ 29 верасьня распачалі падпіску на пазыку індустрыялізацыі. У Камунбанку падпісаліся ўсе працаўнікі, у Дзяржбанку—з 37 чал. падпісалася 34, у «Потребсоюзе» записаліся ўсе супрацоўнікі, у ЦРК—85 чал., у Сельсаюзе—23 чал., а таксама праведзена калектыўная падпіска і па шэрагу іншых устаноў і арганізацый. Усяго напярэдняя падпіска з гэты дзень дала 8.000 руб., а

3-я сялянская пазыка.

(Па тэлеграфу).

Барысаў, 5-Х. Мясцовае сельска-гаспадарчае крэдытнае т-ва рэалізавала пазыкі на 2000 р.

Цімкавічы, 4-Х. За час з 25 верасьня да 1 кастрычніка Цімкавіцкае с.-г. т-ва прадало сялянам пазыкі на 800 р., а за ўвесь час рэалізавана аблігацый на 1400 р.

Грэск, 5-Х. З боку сялян назіраецца вялікае запатрабаваньне на аблігацыі 3-й сялянскай пазыкі. Да 1 кастрычніка рэалізавана пазыкі на 1210 р.

Койданава, 5-Х. Прысланыя з Менску аблігацыі сялянскай пазыкі ўжо цалкам рэалізаваны; прададзена больш як па 1000 р.

Пагост, 5-Х. Мясцовае с.-г. т-ва дагэтуль рэалізавала на 1000 р. аблігацый сялянскай пазыкі. Попыт з боку сялян на пазыку ня спыняецца.

У Прэзыдыуме ЦВК БССР.

1-га кастрычніка пад старшынствам тав. А. Чарвякова адбылося чарговае пасяджэньне Прэзыдыуму ЦВК, на якім разглядаліся пытаньні:

ДАКЛАД ЧАШНІЦКАГА РВК І САДАКЛАД ЧАШНІЦКАГА ЯЎРЭЙСКАГА НАЦСАВЕТУ.

Прэзыдыум ЦВК заслухаў справаздачу старшыні Чашніцкага РВК тав. Кваткоўскага і садаклад старшыні Чашніцкага яўрэйскага нацсавету тав. Германа і садаклад інструктара ЦВК т. Брушкова, які праводзіў абсьледваньне дзейнасьці РВК і нацсавету.

На тэрыторыі Чашніцкага райёну знаходзіцца 8 сельсаветаў з 30287 чал. насельніцтва. Па нацскладу насельніцтва падзяляецца так: беларусаў—90 проц., яўрэяў—6 проц., палякаў—3 проц. і іншых—1 проц.

Па сацыяльнаму складу: 26807 сялян і 287 саматужнікаў.

Зямляўпарадкаваньне ў райёне пачалося ў 1924 годзе і да гэтага часу зямляўпарадкавана 11876 дзес., што складае ў сярэднім 32 проц. ад агульнае плошчы.

Агранэрсанал складаецца з 3 асоб. Абсталяваньне агрэгатнае і аграгабінэты здавальняючае. Ёсьць некаторыя дасягненьні ў галіне папярэньня шматпольля. За 1925 і 26 г. г. праведзена на шматпольле 1760 дз. у 177 гаспадарках.

У райёне існуе 9 мэліярацыйных таварыстваў, якія за апошнія тры гады асушылі 130 дз. балот і прарылі канал на працягу 19000 саж.

Ёсьць дасягненьні ў каапэраваньні насельніцтва.

У параўнаньні з мінулым годам лік пайшчыкаў па спажывецкай каапэрацыі з 1450 чал. павялічыўся да 1777 чал. (што дае павялічэньне на 22 проц.), паявы капітал павялічыўся на 36 проц., зваротныя сродкі на 11 проц.

Таксама значна разгарнулася праца Чашніцкага Крэдытнага Т-ва, якое абслугоўвае ўвесь райён. У 1925-26 годзе т-ва мела 1588 пайшчыкаў з паявым капіталам у 4605 руб., у 1926-27 г. пайшчыкаў ужо было 1801 чалавек з паявым капіталам у 6406 руб., што дае павялічэньне росту пайшчыкаў на 13,80 проц. і паявога капіталу на 13,91 проц.

У параўнаньні з мінулым годам у раёне значна палепшылася мэдыцынскае абслугоўваньне насельніцтва. У 1926 г. пабудована новая больніца.

Таксама палепшылася за апошнія гады становішча народнае асьветы. У райёне ёсьць 24 аднакамплектныя, 7 двухкамплектных і 4-хкамплектная школа і 1 семёгодка. Школы пераведзены на родную мову выкладаньня. Зараз ў Чашніках распачата будаўніцтва яўрэйскай 4-хкамплектнай школы. На кожную школу ў сярэднім прыходзіцца 60-70 вучняў.

ЯК ВЫРАШАЕЦЦА НАЦ ПЫТАНЬНЕ

Прэзыдыум ЦВК заслухаў садаклад аб дзейнасьці старшыні Чашніцкага яўрэйскага нацыянальнага сельсавету. Сельсавет абслугоўвае 2 насялённыя пункты—Чашнікі і в. Зар-Слабада. Па нацскладу насельніцтва падзяляецца: 1675 яўрэяў, 1308 беларусаў і 18 палякаў.

Як дасягненьне ў працы нацсавету, трэба зазначыць, што там правільнае вырашэньне нацпытаньня і ў выніку не назіраецца розьні паміж насельніцтвам на нацыянальнай глебе.

Адмоўныя бакі ў працы савету: нацсавет прымаў слабы ўдзел ў гаспадарчым будаўніцтве мясточка; усю гэту працу выконваў райвыканком.

Па дакладзе Чашніцкага РВК і садакладзе Чашніцкага яўрэйскага нацсавету прэзыдыум ЦВК зазначыў наступнае:

Райвыканком і сельсаветы (нацсавет) значна пашырылі сваю працу, якая ў большасьці носіць плянавы характар.

У асноўным правільна выконваюцца дырэктывы савецкай улады ў галіне правядзеньня нацпалітыкі: усе райённыя ўстановы, сельсаветы і школы перайшлі на беларускую мову; для абслугоўваньня нацменшасьцяў існуюць расейская, яўрэйская і польская школы; арганізацыя нацсавету поўнасьцю сябе апраўдала, і нацсавет карыстаецца належным аўтарытэтам сярод насельніцтва.

Таксама маюцца значныя дасягненьні ў справе зямляўпарадкаваньня з частковым пераходам на шматпольле, росту пайшчыкаў і паявога капіталу ў каапэрацыйных т-вах, часткова праведзена каапэраваньне беднаты.

Ёсьць дасягненьні ў справе народнай асьветы: пашырана школьная сетка і павялічан ахоп школамі дзяцей.

Адначасна з гэтым Прэзыдыум ЦВК зварочвае ўвагу на недахопы ў арганізацыйнай працы; невыстарчальна разгорнута праца камісій сельсавету, не праводзяцца сыстэматычна ў жыцьцё дырэктывы аб справаздачнасьці перад насельніцтвам. Сельсаветы слаба праводзяць мерапрыёмствы па выхаванню сяброў савету на практычнай працы; слаба наогул удзігнуты ў працу саветаў сялянскі актыў і жаночы ў прыватнасьці.

Як недахоп у правядзеньні нацпытаньня трэба адзначыць невыстарчальнасьць працы на яўрэйскай мове ў палітасьветных установах мястэчка і адсутнасьць ліпункту на яўрэйскай мове.

У галіне зямляўпарадкаваньня слаба разгорнута справа травасеяньня і невыстарчальна зьвернута ўвага на працу мэліярацыйных і тарфяных т-ваў. Таксама трэба адзначыць слабую працу сялянскіх камітэтаў узаемадапамогі і не выстарчальны ўдзел насельніцтва ў грамадзкіх арганізацыях (МОПР, Асоавіяхім, Прэч Няпісьменнасьць).

ЛЬГОТЫ І ПАЛЁГКІ ВАЙСКОЎЦАМ.

Прэзыдыум ЦВК, заслухаўшы даклад аб выніках правядзеньня ў БССР Кодэксу аб льготах вайскова-служачых і іх сем'яў пастанавіў:

Абавязаць усе сельскія гарадзкія і мястачковыя саветы завесьці сталы вучот сем'ям вайскова-служачых і даваных ім льгот.

Наркому РСІ даручана скласьці форму вучоту.

Усе саветы і выканаўчыя камітэты павінны ўключыць прадстаўленыя льготы вайскова-служачым у свае планы работ.

РВК і АВК абавязаны пэрыядычна заслухоўваць даклады аб працы па прадстаўленьні льгот вайскова-служачым і іх сем'ям. Усе органы савецкай улады абавязаны вельмі ўважліва адносіцца да лістоў і заяў чырвонаармейцаў і іх сем'яў і тэрмінова іх разглядаць.

Усе акруговыя і райённыя выканаўчыя камітэты павінны прыняць захады да папулярызацыі Кодэксу Законаў аб льготах.

УВЯДЗЕНЬНЕ Ў СІЛУ ЗАКОНАЎ БССР НА ТЭРЫТОРЫІ БЫЛ. ГОМЕЛЬСКАЙ ГУБЭРНІ.

Прэзыдыум ЦВК БССР пастанавіў з 1-га кастрычніка 1927 году ўвесьці ў сілу на далучанай да БССР тэрыторыі б. Гомельскага і Рэчыцкага павету Гомельскай губ. РСФСР пастанову ЦВК і СНК БССР ад 1-га лютага 1925 г. „Аб перадачы ў распарадженьне камунальных аддзелаў часьці жылое плошчы немуніцыпалізаваных будоў".

ЦЭНТРАЛЬНАЯ КАМІСІЯ ПА ПРАВЯДЗЕНЬНІ ПАЗЫКІ ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫІ.

Прэзыдыум ЦВК выдзеліў Цэнтральную камісію па рэалізацыі пазыкі індустрыялізацыі ў складзе: т. т. Хацкевіча (старшыня) і членаў: Барашкі, Абрамсона, Раманчука, Каплана і Стракоўскага.

СКЛАД АКРУГОВАГА ЗЬЕЗДУ РАБОТНІЦ І СЯЛЯНАК.

Прэзыдыум ЦВК задаволіў просьбу Менскага АВК аб павялічэньні складу Менскага акруговага зьезду работніц і сялянак да 200 дэлегатак.

Барацьба з няпісьменнасьцю пашыраецца.

У працы т-ваў „Прэч няпісьменнасьць" за мінулы год поруч з шэрагам дасягненьняў выяўлены і некаторыя недахваты. Першы, і самы галоўны недахват, гэта тое, што т-вы працу праводзілі няплянава. Падругое, т-вы не зьвярнулі сваячасова належнай увагі на працу па падрыхтоўцы матар'яльных сродкаў, што таксама адбілася на далейшай працы.

Т-ва таксама мала зьвяртала ўвагі на мэтадычны бок працы. Выходзячы з гэтага, Цэнтральны Савет т-ва „П. П." апрацаваў шэраг дырэктыў аб прынцыпах працы нізавых арганізацый у бягучым навучальным годзе. Згодна гэтага, уся праца т-ваў па ліквідацыі няпісьменнасьці павінна абавязкова весьціся па поўным пляне. Першачарговай задачай у працы т-ваў павінна зьявіцца не арганізацыя самастойных ліпунктаў, а ўсяляная дапамога дзяржаўным і іншым арганізацыям у працы па ліквідацыі няпісьменнасьці. Гэта дапамога т-ваў «П. П.» павінна выяўляцца ў адшуканьні памяшканьняў, захаду да падняцьня якасьці працы на гэтых ліпунктах, назіраньні за сваячасовым і цоўным скарыстаньнем сродкаў, адпушчаных на гэту патрэбу і г. д. У сваёй далейшай працы т-вам асаблівую ўвагу неабходна зьвярнуць на мэтадычную падрыхтоўку ліквідатараў, якія прыцягваюцца да працы па ліквідацыі няпісьменнасьці.

Т-вы таксама павінны весьці шырокую выхаваўчую працу па ўсіх ліпунктах. Гэта праца павінна выяўляцца ў сыстэматычным растлумачэньні статуту т-ва, яго мэтаў і г. д. У гэтым навучальным годзе ўся праца т-ваў павінна быць, галоўным чынам, накіравана на вёску. На вёсцы павінна быць разгорнута праца ня толькі па арганізацыі ліпунктаў і гурткоў індывідуальнага навучаньня, але і на арганізацыі ячэек і выяўленьні сялянскага актыву.

У сёлетнім навучальным годзе будзе зьвернута асаблівая ўвага на максымальнае разгортваньне працы ў Жактах, дзе ў першую чаргу будуць ахоплены хатнія працаўніцы, беспрацоўныя, саматужнікі і г. д. У гэтай галіне ўжо ёсьць поўныя дасягненьні па Менску і Віцебску.

С У Д.

Кахаць ня прымусіш.

4 кастрычніка ў Менскім Акруговым Судзе пад старшынствам тав. Грамыка разгледжана справа Аляксандра Даніловіча. Суд прыгаварыў яго на 8 год зьняволеньня з суровым адмежаваньнем. Прыняўшы пад увагу пазначаныя вынікаў ад зробленага злачынства, суд знайшоў магчымым скараціць кару напалову, пакінуўшы Даніловічу 4 гады зьняволеньня.

Акалічнасьці гэтай справы наступныя:

А. Даніловіч кахаўся з Марыляй Казлоўскай (праж. у Менску на Беларускай Слабадзе) з 1924 году. Спачатку ўсё было добра, бо Казлоўская з увагай адносілася да Даніловіча: ня гуляла з іншымі хлопцамі, на прапановы жаніцьба--нічога канкрэтнага не казала і г. д. Так ішлі гады.

У 1927 годзе Даніловіч заўважыў, што Марыля калі-некалі пахаджае з другімі хлопцамі і што на яго яна зьвяртае менш увагі. Даніловіч часьцей стаў гаварыць аб Загсе, але Казлоўская не згаджалася.

26 ліпеня 1927 году Даніловіч паймоў да шваграа Сідарава, якога дома не аказалася. Даніловіч адчыніў столік і, убачыўшы там рэвальвэр, адразу пабудаваў пэлы плян. Ён схаваў рэвальвэр у кішэнь. Выпіўшы для «храбрасьці», Даніловіч пашоў да Марылі.

— Добры вечар, Марыля!

— Добры вечар!

— Як жывеш?

— Нішто... Сумую...

— Сумуеш?.. Цікава водаць, чаго ты сумуеш?

— Ты не падумай толькі, што на табе.

— Ведаеш што, Марыля, жарты-жартамі, а давай сходзім у Загс зарэгістравацца.

— Не, я ў Загс не пайду.

Даніловіч да гэтага часу ня чуў такога дакладна-канкрэтнага адказу. Гэты адказ яшчэ больш расхваляваў яго. Нічога ня кажучы, ён выхапіў з кішэні рэвальвэр і два разы выстраліў. Адна куля папала Казлоўскай у грудзі, зрабіўшы вылётную рану праз верхавіну правага лёгкага. Праз некаторы час нараненая вычуняла.

С. Азер.

СУДОВАЯ ХРОНІКА.

ЗА СУПРАЦІЎЛЕНЬНЕ ЎЛАДЗЕ.

Браты Мікалай і Ігнат Скачкі з вёскі Пудзіцкая-Слабада, Пухавіцкага райёну, будучы ў м. Дукорах на кірмашы, у часе гандлю з крамы спажывецкага таварыства ўкралі плуг. Калі іх затрымалі, і вясковыя выканаўцы саправаджалі іх у райён міліцыі і Скачкі, рыхтуючыся ўцячы, набілі выканаўцаў, прычым аднаго з іх моцна зьнявечылі. Менскі акруговы суд прыгаварыў Ігната Скачка на два гады, а Мікалая Скачка—на год зьняволеньня.

ПОМСТА БАЦЬКУ.

Пасьля падзелу маемасьці, зямлі і жывёлы паміж Нікадымам Доўнарам і дачкой яго Юзэфай Доўнар-Змачынскай вёскі, Булынічына, Койданаўскага райёну, апошняя вельмі разгвалася на бацьку за тое, што ён ня даў ёй будынку. Калі міліцыя прыехала на выканаўчым лісьце высьляць Юзэфу Змачынскую з хаты бацькі, яна схапіла газу і сярнічкі і падпаліла будынкі. Гэта заўважылі суседзі, пры дапамозе якіх пажар быў ліквідаваны.

Выязная сэсія акруговага суду, прымаючы пад увагу няпісьменнасьць і беднасьць Юзэфы Змачынскай, а таксама і тое, што на яе выхаваньні знаходзіцца малыя дзеці, прыгаварыла Юзэфу Змачынскую [на адзін год зьняволеньня ўмоўна.

ФІЗКУЛЬТУРА.

Падрахунак летняга спартыўнага сэзону на Беларусі.

Нябывала жвава прайшоў (у параўнаньні з мінулымі) летні спартыўны сэзон на Беларусі.

Ня гледзячы на брак матар'яльных сродкаў, ва ўсіх округах былі наладжаны ці даналаджаны летнія спартпляцоўкі і набыты спортінвэнтар. Праведзены ў кожнай акрузе гурткавыя, міжсаюзныя і акруговыя спаборніцтвы па футболу, баскетболу, лёгкай атлетыцы і водазмну спорту.

Далей, праведзена ўсебеларуская спартакіяда, якая ўзварухнула пэрагі беларускіх фізкультурнікаў і, наогул, грамадзянства.

Міжнароднае спатканьне беларускіх фізкультурнікаў з чэхаславакамі, паездкі ў Маскву на ўсесаюзныя спаборніцтвы беларускіх прафсаюзных калектываў ФК і, урэшце, камандыроўка лепшага беларускага калектыву ў Маскву на ўсерасейскую спартакіяду (дзе беларускімі фізкультурнікамі было ўстаноўлена некалькі ўсесаюзных рэкордаў).

Гэта ўсё гаворыць за тое, што беларускія фізкультурнікі ў прайшоўшым сэзоне зрабілі вялікі крок наперад, і што фізкультура на Беларусі пашыраецца. Вярбуюцца ў шэрагі фізкультурнікаў усё больш і больш як удзельнікаў, гэтак і, наогул, прыхільнікаў з грамадзянства, якое яшчэ нядаўна лічыла справу фізкультуры толькі забавай.

Рознае.

ДРАЎЛЯНЫ ВЭЛЁСЫПЭД.

Расейскі селянін-саматужнік Сейфулін врабіў драўляны вэлёсыпэд. Гэты вэлёсыпэд яму каштаваў 15 руб. На ім можна разьвіць хуткасьць да 20 кілёмэтраў у гадзіну.

КАБЕЛЬ, ЯКІ СЬВЕЦІЦЦА.

У буйнейшых замежных парток пачынае шырока практыкавацца кабель, які сьвеціцца. Ён пракладваецца па марскому дну і ўказвае лоцманам правільны напрамак у порт.

КАПАБЛАНКА — ДЫПЛЁМАТЫЧНЫ ПРАДСТАЎНІК.

Сусьветны чэмпіён па шахматах Капабланка радзіўся на высьне Куба (каля берагоў Амэрыкі). Гэта высна надала яму правы свайго дыплёматычнага прадстаўніка ва ўсіх краінах, у якіх яму здарыцца бываць.

ГОД У ЛЕТАРГІЧНЫМ СЬНЕ.

Жонка лёнданскага фармэра Лёнланта год таму назад заснула летаргічным сном. Сон цягнуўся цэлы год. Увесь гэты час яна была пад наглядам дактароў. Зараз сон прайшоў, і фэрмэрша аджыла.

ШТУЧНЫ КАКАІН.

У Нямеччыне лябараторным спосабам здабываецца штучны какаін. Выраблюць яго з рэштак, што застаюцца пасьля вырабу каўчуку. У бэрлінскіх больніцах такі какаін ужо ўжываецца. Штучны какаін па сваіх якасьцях зусім замяняе запраўдны какаін, каштуе значна таньней, чымся апошні.

ЧЫГУНАЧНЫ РЭКОРД.

Новы сусьветны рэкорд чыгуначнай камунікацыі ўстаноўлен у Англіі між Лёнданам і Шатлянядыі.

Скоры поезд гэтай чыгунк